Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б

№ 217 (5880)
ВЕРАСНЯ
28
ПЯТНІЦА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Москва
ЦК ВКП(б) Сельхозотдел комната 639
на 1934 г. Иосифова
Звезда—1

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ВККІ АД 5-га ВЕРАСНЯ 1934 г. АБ ПЕРАНЯСЕННІ ТЭРМІНУ СКЛІКАННЯ VII КАНГРЭСА КІ*)

Прэзідыум ВККІ, разгледзеўшы прапановы раду секцый КІ аб перанясенні тэрміну склікання 7-га кангрэса КІ на 1935 год, пастанаўляе:

1. Перанесці тэрмін склікання VII кангрэса КІ з другой паловы 1934 года на першую палову 1935 года.

2. Журнал «Коммунистический Интернационал» і партдрук паасобных секцый павінны неадкладна прыступіць да асвятлення пытанняў, якія стаяць у парадку дня VII кангрэса.

3. Секцыі КІ павінны арганізаваць абмеркаванне пытанняў парадку дня VII кангрэса ў партыйных арганізацыях, улічваючы прыгатым урокі і вопыт сваёй барацьбы і работы з часу VI кангрэса КІ.

*) Апублікавана ў «Юманіце» № 13064 ад 22-IX 1934 года.

БОЛЬШЭВІКІ ГОМЕЛЯ, УСЕ СІЛЫ— НА ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯ ЦК ВКП(б)

ЦК ВКП(б) заслухаў паведамленне аб рабоце Гомельскай партыйнай арганізацыі.

У рашэнні дана вынікоўна яркая і глыбокая ацэнка становішча Гомельскай партыйнай арганізацыі, становішча ўсёй гаспадарча-палітычнай работы.

Пастанова ЦК з ленінскай глыбінёй ускрывае тыл прарывы і памылкі, якія мелі і маюць месца зараз у кіраўніцтве партыйнай арганізацыі. Асноўным і рашаючым з'яўляецца, як зусім правільна ўказана ў рашэнні ЦК, недастатковая ідэйная згуртаванасць арганізацыі і слабасць унутрыпартыйнай работы. Гэта магло здарыцца таму, што гарком партыі яшчэ не перабудаваўся ў адпаведнасці з рашэннямі XVII з'езда ВКП(б) і гістарычнымі ўказаннямі правадыра партыі таварыша Сталіна.

«Сапраўдную перабудову партыйнай работы, канкрэтнае кіраўніцтва первічнымі партарганізацыямі гарком падмяніў знешне-палітычнай шумнай, вынясенням агульнадзяржаўных рэзалюцый і рашэнняў». Указанне ЦК ВКП(б) лішні раз падкрэслівае, якая вялізарная адказнасць кладзецца на партыйным арганізацыі ў справе перабудовы па-аператыўнаму ўсёй работы. Іменна гэта цяпер з'яўляецца галоўным. Нельга дабіцца выканання тых вялізарнейшых задач, якія пастаўлены XVII з'ездам партыі, не перабудаваўшы ўсёй работы.

Толькі гэтым можна тлумачыць, што цэлы рад партыйных арганізацый цягнуцца ў хвосце па выкананню чарговых важнейшых гаспадарча-палітычных задач. Часта добрыя рэзалюцыі і добрыя прамовы яшчэ нічога не варты, калі яны не падмацаваны жывымі, большэвіцкімі справамі. Вось чаму ў гэтай сувязі становішча зразумелым адставанне Гомеля па цэламу раду гаспадарча-палітычных кампаній. Было-б няправільным лічыць, што ў Гомелі ёсць нейкія асобыя ўмовы, нейкія аб'ектыўныя прычыны, перашкаджаючыя яму выканаць поўнасцю план як па прамысловасці, так і па сельскай гаспадарцы. Іх няма і не можа быць.

Гомельская партыйная арганізацыя мае вялікую праслойку рабочага класа, буйную прамысловасць і разнітую сельскую гаспадарку. Па свайму эканамічнаму і палітычнаму значэнню Гомельская партарганізацыя займае адно з першых месц у КП(б)Б. Аднак, практычная яе работа рэзка адстае ад тых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца партыяй.

Промфінплан па прамысловасці з месяца ў месяц не выконваецца. У сельскай гаспадарцы Гомель таксама адстае. Як указвае ў сваім рашэнні ЦК, «адставанне ўнутрыпартыйнай работы ў Гомельскай парторганізацыі, няўменне яе ўвязаць з вырашэннем гаспадарчых задач сказаліся і ў тым, што пераважная большасць важнейшых прадпрыемстваў горада сістэматычна не выконвае сваіх промфінпланаў. Асабліва адстае выкананне якасных паказальнікаў».

Гэта гаворыць аб тым, што гарком слаба змагаўся за ажыццяўленне в гістарычных умоў тав. Сталіна.

Слабасць партыйнай і совецкай работы па кіраўніцтву гаспадарчымі і палітычнымі кампаніямі прывяла да гэтых ганебных паказальнікаў. Кіраўнікі гаркома і горсовета не выконалі ўказання таварыша Сталіна аб тым, што «арганізацыя работы вырашае ўсё. Поспех справы залежыць ад арганізацыі работы, ад арганізацыйнай барацьбы за правядзенне ў жыццё лініі партыі, ад правільнага падбору людзей, ад праверкі выканання кіруючых органаў».

Яны не зразумелі таго, што поспех справы вырашаюць жывыя людзі, жывое большэвіцкае кіраўніцтва імі. І выключна правільна адзначае ЦК, што на бюро гаркома не заслухоўваліся справаздачы партарганізатараў, асобных комуністаў і т. д. За слабасной, парадной шумнай выпаў з поля зроку член партыі.

Асабліва трэба падкрэсліць вельмі нездавальняючую работу горсовета. Кіраўніцтва яго на чале з былым старшынём Каркачовым не займалася справамі. Безадказнасць, не-большэвіцкія адносіны да справы прывялі да таго, што кіраўніцтва горсовета цягнулася ў хвосце важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Віна гаркома і ў тым, што ён своечасова не здолеў узняць работу горсовета, не пакідаваў буйнейшых недахопаў у рабоце горсовета.

Работа над выхаваннем і вырошчваннем кадраў, асабліва з нарэнных нацыянальнасцей ва ўмовах Беларусі, як нацыянальнай рэспублікі, набывае выключна вялікае палітычнае значэнне. У залежнасці ад правільнага кіраўніцтва і ідэйнага іх згуртавання вакол генеральнай лініі партыі вырашаецца поспех работы. Трэба сказаць, што ў Гомелі гэту важнейшую работу недасцаналі.

Частка кіраўнікоў гаркома і горсовета (Карначоў, Гайдукевіч і іншыя) замест большэвіцкага выхавання кадраў адміністравалі, камандавалі, дапускалі нецярпімыя, а па сутнасці антыпартыйныя метады ў кіраўніцтве масамі.

Панска-самаўпэўныя, шкодныя адносіны да нізавога работніка, члена партыі сталі ўлюбёным метадам асобных кіраўнікоў. Няма чаго і даказваць, што такога роду адносіны да комуніста нічога агульнага не маюць з лініяй партыі. «Адзначальная рыса большэвіка—пільнасць і стрыманасць»—вось чаго не хапала ў асобных кіраўнікоў гомельскай партарганізацыі.

ЦК ВКП(б) падкрэсліў бытавое разлажэнне асобных работнікаў актыва.

Разам з масамі, на чале мас—такі позынг нашай партыі. Трэба шырэй і больш рашуча разгарнуць большэвіцкую крытыку і самакрытыку ў арганізацыі, не зважаючы на асобы. І трэба дабіцца, каб гэта крытыка была дзейсной. Іменна толькі гэта можа забяспечыць поспех ва ўсёй рабоце.

Усякія спробы заглушыць самакрытыку павінны сустрэць самы рашучы, бязлітасны адпор.

Пытаннем ідэйна-палітычнага выхавання арганізацыі трэба аддаць выключна вялікую ўвагу. Для таго, каб ідэйна згуртаваць рады партыйнай арганізацыі, трэба разгарнуць шырокую работу па марксісцка-ленінскаму выхаванню. Тэорыя Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна ёсць тая невычарпальная крыніца, беручы з якой веды мы ідэйна ўзброёваем і згуртоўваем рады партыйнай арганізацыі.

У Гомелі справа партыйнага выхавання значна адстае. І гэта асабліва абавязвае горком зараз прыняць усе меры к таму, каб узняць ідэйна-палітычны ўзровень комуністаў. Спалучаючы рэвалюцыйную тэорыю з рэвалюцыйнай практыкай, партыйная арганізацыя павінна дабіцца поспехаў у рабоце.

Гарком і партыйная арганізацыя ў цэлым, кожны кіруючы совецкі і кааператыўны работнік павінны ўзмацніць сваю работу ў напрамку барацьбы з раскрадальнікамі грамадскай упасныі, подырамі, рвачамі, жулікамі і т. д. За апошні час у Гомелі былі асобныя факты, якія сведчаць аб наяўнасці няправільных адносін да грамадскай упасныі, факты няправільных, а часамі і напляваецельскіх адносін да совецкіх законаў. З такога роду праяўленнямі трэба павесці самую жорсткую барацьбу. Партыя не можа цярпець у сваіх радах тых, хто не выконвае яе рашэнняў і законаў урада, хто забывае неаднаразовае папярэджанне таварышом Сталіным, што «комуніст часамі лічыць законы дзяржавы і т. п. рэчы справай сямейнай. Іменна таму іншаму комуністу не цяжка часамі перашагнуць накшталт свінні (выбачайце, таварышы, за выраз) у агарод дзяржавы і хапнуць там ці пакаразць сваю шчодрасць за кошт дзяржавы».

Умацоўваючы боездольнасць партыйнай арганізацыі, згуртоўваючыся на аснове генеральнай лініі партыі, гарком павінен узмацніць барацьбу з усякага роду праяўленнямі апартунізма ў тэорыі і на практыцы, з усякага роду праяўленнямі дробнабуржуазнай распушчанасці, сямейнасці, групаўшчыны, з усякага роду парушэннямі партыйнай этыкі, выручваючы налёты мяшчанства, абываталышчыны ў асобных праслойках членаў партыі.

Урок Гомеля павінны ўлічыць усе партыйныя арганізацыі.

Узмацненне партыйнай, совецкай і гаспадарчай работы, разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, матутны размах соцспаборніцтва і ўдарніцтва, перабудова работы зверху да нізу—вось што забяспечыць поспех ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва.

ЦК ВКП(б) моцна папярэдзіў гарком партыі і яго сакратара тав. Шафарэнко аб неабходнасці рашуча ўзмацніць аператыўнае кіраўніцтва первічнымі парторганізацыямі і ўмацаваць іх ідэйна-палітычнае выхаванне.

Гэта абавязвае гарком і яго сакратара тав. Шафарэнко неадкладна прыняць усе меры да выпраўлення дапушчаных памылак і недахопаў, мабілізаваць усіх комуністаў, рабочых і калгаснікаў на большэвіцкае выкананне рашэння ЦК ВКП(б).

Няма больш ганаровай задачы для большэвіка, як выкананне рашэнняў партыі. І трэба зараз напружыць усе сілы, мабілізаваць усю арганізацыю на неадкладнае, безагаворачнае выкананне пастановы ЦК ВКП(б).

І Ў ГЭТЫМ ЦЯПЕР ГАЛОЎНАЕ.

БССР ЗАВЯРШЫЛА СЯЎБУ

МЕНСК, 25 верасня. (Молнія). План асімай сяўбы соўгасамі Наркамзема, калгасамі і аднаасобным сектарам, па даных на 23 верасня, выкананы поўнасцю. Засеяна соўгасамі 7.784 гектары, калгасамі і аднаасобнікамі — 1.150.585 гектараў.

НАРКАМЗЕМ БССР БЕНЕК.
(«Известия»).

Сёння спаўняецца 70 год з дня заснавання Першага Інтэрнацыянала

„...Комуністычны Інтэрнацыянал з'яўляецца адзіным прадаўжальнікам прынцыпаў Першага Інтэрнацыянала, правадзімых на новай масавай аснове рэволюцыйнага пролетарскага руху...“ (З ПРАГРАМЫ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА)





КАРЛ МАРКС АБ ПРЫЧЫНАХ РАСПАДУ ПЕРШАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА І ЯГО ГІСТАРЫЧНЫМ ЗНАЧЭННІ

З узвышанага пункту погляду астраўнога «філістэра» містэр Джордж Гоўэл (адзін з апартуністычных правадыроў трэд-юніяністаў) паведамляе «асвечаным чытачам» «Дэйлітнацдатага стагоддзя» што Інтэрнацыянал пацярпеў «паўдачу» і ўпаў.

У сапраўднасці-ж соцыял-дэмакратычныя рабочыя партыі, арганізаваныя ў больш ці менш нацыянальным маштабе ў Германіі, Швейцарыі, Даніі, Партугаліі, Італіі, Бельгіі, Галандыі і Злучаных Штатаў Амерыкі, складаюць міжнародныя групы, якія не з'яўляюцца ўжо разрозненымі секцыямі, у невялікай колькасці рассеянымі па розных краінах і аб'яднаўшымі звонку Генеральным советам, а ўтвараюцца самымі рабочымі масамі, якія знаходзяцца ў пастаянным актыўным і непасрэдным абмеркаванні, спаянымі абменам думкамі, узаемнай дапамогай і агульнымі імкненнямі.

Пасля падзення Парыжскай Комуны ўсе рабочыя арганізацыі ва Францыі былі, зразумела, часова разгромлены, але зараз яны зноў пачынаюць аднаўляцца. З другога боку, наперакор усім палітычным і соцыяльным перашкодам, славяне, у асаблівасці ў Польшчы, Балгарыі, і Расіі, у даны момант прымаюць удзел у міжнародным руху ў такіх размерах, якіх у 1872 годзе не мог-бы прадбачыць самы вялікі аптыміст.

Такім чынам, замест таго, каб адмерці, Інтэрнацыянал толькі перайшоў з першага перыяда зараджэння ў больш высокі, у якім першапачатковыя яго імкненні часткова ўжо сталі рэчаіснасцю. У ходзе свайго прагрэсуючага развіцця ён павінен будзе перацярпець яшчэ шмат змен, менш чым зможа быць напісан апошні раздзел яго гісторыі.

ЛЕНІН АБ ЗНАЧЭННІ ПЕРШАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА

Першы Інтэрнацыянал, аснаваны Марксам, існаваў з 1864 па 1872 год. Паражэнне геройскіх парыжскіх рабочых — знамянітай Парыжскай Комуны — азначала канец гэтага Інтэрнацыянала. Ён незабываемы, ён вечны ў гісторыі барацьбы рабочых за сваё вызваленне. Ён залажыў фундамент таго будынка сусветнай соцыялістычнай рэспублікі, які мы маем цяпер магчасць будаваць... (Ленін, т. XXIV, стар 194).

Першы Інтэрнацыянал (1864-1872) залажыў фундамент міжнароднай арганізацыі рабочых для падрыхтоўкі іх рэволюцыйнага націску на капітал. Другі Інтэрнацыянал (1889-1914) быў міжнароднай арганізацыяй пролетарскага руху, рост якога пайшоў у шырыню, што не абышлося без часовага паніжэння вышыні рэволюцыйнага ўзроўню, без часовага ўзмацнення апартунізма, які прывёў урэшце да ганебнага краху гэтага Інтэрнацыянала... (Ленін т. XXIV, стар. 247).

ЗА ЧАС ІСНАВАННЯ ПЕРШАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА АДБЫЛІСЯ НАСТУПНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ І З'ЕЗДЫ

25-29 верасня 1865 года — Лонданская канферэнцыя. У парадку дня стаялі пытанні аб прафесіянальным руху, аб ролі руска га царызма ў Еўропе, аб адчаўленні Польшчы, аб пастаянай арміі.

3-8 верасня 1866 года — Жэнеўскі кангрэс. На гэтым кангрэсе быў прынят статут і асноўныя прынцыпы праграмы. Бы бой з пруданістамі.

2-8 верасня 1867 года—кангрэс у Лазанне. На гэтым кангрэсе было высунута пытанне аб ролі дзяржавы і аб палітычных задачах пролетарыята і пытанне аб вайне і міжнароднай палітыцы рабочага класа.

6-15 верасня 1868 года — кангрэс у Бруселі, які мітыцц паваротным пунктам у развіцці Інтэрнацыянала. Пруданісты пацярпелі паражэнне. На кангрэсе ўпершыню былі прадстаўнікі — вялікіх рабочых арганізацый і, у прыватнасці, былі прадстаўлены германскія рабочыя.

6-12 верасня 1869 года — кангрэс у Базелі. Узнікненне ба кунізма.

17-23 верасня 1871 года — канферэнцыя ў Лондане. Асноўным было пытанне аб расколе ў Інтэрнацыянале.

2 верасня 1872 года — кангрэс у Гаазе. На ім адбыўся раскол бакунінская меншасць вышла са складу Інтэрнацыянала і прынята было рашэнне перанесці месцапрабыванне генеральнага совета ў Нью-Юрк.

АБ АДЗІНАЧАСОВЫМ ПАДАТКУ НА АДНААСОБНЫЯ СЯЛЯНСКІЯ ГАСПАДАРКІ У 1934 ГОДЗЕ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляюць:

Устанавіць для аднаасобных сялянскіх гаспадарак адзіначасовы падатак на наступных асновах:

I. Да адзіначасовага падатку прыцягваюцца аднаасобныя сялянскія гаспадаркі як у сельскіх мясцовасцях, так і ў тых пасёлках і гарадскіх паселішчах, з якіх узімаецца сельска-гаспадарчы падатак у 1934 г.

II. Стаўкі адзіначасовага падатку ўстанаўляюцца ў наступных размерах:

1) Аднаасобныя гаспадаркі, абкладаемыя ў 1934 г. сельска-гаспадарчым падаткам па цвёрдых стаўках, уплачваюць адзіначасовы падатак у наступных размерах:

а) не маючыя рабочай жывёлы і рыначных даходаў, прыцягваемых к абкладанню сельска-гаспадарчым падаткам,— ад 15 да 25 руб.;

б) не маючыя рабочай жывёлы, але маючыя рыначныя даходы — ад 30 да 50 руб.;

в) маючыя рабочую жывёлу — ад 50 да 125 руб.

2) Аднаасобныя гаспадаркі, абкладаемыя ў 1934 г. сельска-гаспадарчым падаткам па прагрэсіўных стаўках, уплачваюць адзіначасовы падатак у наступных размерах:

а) не маючыя рабочай жывёлы і рыначных даходаў, прыцягваемых к абкладанню сельска-гаспадарчым падаткам, — ад 75 да 100 проц. акладу сельска-гаспадарчага падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі адзіначасовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, якія ўплачваюць сельска-гаспадарчы падатак па цвёрдых стаўках (арт. 1.);

б) маючыя рабочую жывёлу або рыначныя даходы — ад 100 да 175 проц. акладу сельска-гаспадарчага падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі адзіначасовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, якія ўплачваюць сельска-гаспадарчы падатак па цвёрдых стаўках (арт. 1).

3) Кулацкія гаспадаркі ўплачваюць адзіначасовы падатак у размеры 200 проц. акладу сельска-гаспадарчага падатку 1934 г.

4) Гаспадаркі, якія злосна не выконваюць заданых ім планаў пасеву і абавязковых паставак сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве, абкладаюцца адзіначасовым падаткам на агульных асновах, але сума падатку з іх падваяецца.

III. У межах гэтых стаўак (арт. 2) советы народных камісараў саюзных рэспублік, не маючых краявога ці абласнога падзелу, советы народных камісараў аўтаномных рэспублік, краявыя (абласныя) выканаўчыя камітэты ўстанаўляюць канчатковыя стаўкі адзіначасовага падатку па раёнах, прычым для мясцовасцей з асабліва вялікімі грашовымі даходамі стаўкі адзіначасовага падатку могуць быць павялічаны, але не больш чым на 50 проц. супроць граніцных стаўак, указаных у арт. II данай пастановы.

IV. Тэрміны ўплаты адзіначасовага падатку ўстанаўляюцца советамі народных камісараў саюзных рэспублік, не маючых краявога (абласнога) падзелу, советамі народных камісараў аўтаномных рэспублік, краявымі (абласнымі) выканаўчымі камітэтамі з такім разлікам, каб 50 проц. сумы падатку паступіла не пазней 15 лістапада 1934 г. і ўвесь падатак не пазней 15 снежня 1934 г.

Для ўплаты адзіначасовага падатку кулацкімі гаспадаркамі ўстанаўляецца адзін тэрмін, пры гэтым не пазней 15 лістапада 1934 года.

V. У выпадку няўплаты падатку ва ўстаноўлены тэрмін сельскія советы абавязаны прымяняць налёўныя меры прымусовага спагнання ў дакладнай адпаведнасці з законамі аб спагнанні нядоімак па падатках.

VI. Ад адзіначасовага падатку поўнасцю вызваляюцца:

а) гаспадаркі рабочых і служачых, якія вядуць сельскую гаспадарку на прысядзібнай зямлі маючыя не больш адной каровы, пробную жывёлу, сенакосы, але не маючыя галавой зямлі і рабочай жывёлы, калі заработная плата з'яўляецца асноўнай крыніцай іх даходу;

б) гаспадаркі калгаснікаў;

в) аднаасобныя гаспадаркі, вызваленыя ў 1934 г. ад сельска-гаспадарчага падатку па маламоцнасці:

г) гаспадаркі, у склад якіх уваходзяць:

1) Героі Совецкага Саюза, асобы, узнагароджаныя ордэнамі Саюза ССР або ганаровай рэволюцыйнай зброяй, і героі працы;

2) Ваеннаслужачыя кадрачага радавога і малодшага начальніцкага складу тэрміновай (бесперапыннай) або звыштэрміновай службы, не выключаючы і прызваных у восень 1934 г.;

3) Кадравыя і што знаходзяцца ў рэзерве РСЧА ваеннаслужачыя сярэдняга, старшага і вышэйшага начальніцкага складу:

4) Ваеннаслужачыя малодшага камандзнага складу, пералічаныя з доўгатэрміновага водпуску ў пераменны склад тэрытарыяльных часцей;

5) Тыя асобы сярэдняга і старшага начальніцкага складу, якія знаходзяцца ў доўгатэрміновым водпуску, запасе і ў пераменным складзе тэрытарыяльных часцей РСЧА, якія ў якасці штатных работнікаў арганізацый Асоавіяхіма праводзяць ваенную падрыхтоўку працоўных;

6) Быўшыя чырвонагвардэйцы і чырвоныя партызаны;

7) Асобы страявога і адміністратыўна-гаспадарчага складу, рабочыя ваенізаванай аховы, ваенізаванай пажарнай аховы прадпрыемстваў і пабудаванняў, маючых асаблівае дзяржаўнае значэнне, асобы аператыўна-страявога і адміністратыўна-гаспадарчага складу рабоча-сялянскай міліцыі, а таксама асобы аператыўнага, адміністратыўна - гаспадарчага складу папраўча-працоўных устаноў;

8) Інваліды вайны і працы, адносныя да першай, другой і трэцяй груп інвалідзнасці;

д) гаспадаркі сем'яў сельскіх актывістаў, пацярпеўшых ад кулацкай помсты, і гаспадаркі сем'яў работнікаў лесу, забітых у часе выканання імі службовых абавязкаў;

е) аднаасобныя гаспадаркі, якія закантрактаваліся або самазамацаваліся на тэрмін не менш аднаго года на падземную работу ў вугольнай прамысловасці, гаспадаркі, перайшоўшыя ў 1934 г. на пастаянную работу ў соўгасы па працоўных дагаворах на час не менш сельска-гаспадарчага сезона, гаспадаркі перасяленцаў, вызваленыя ў 1934 г. ад сельска-гаспадарчага падатку, і гаспадаркі старацелеў-залатаношчыкаў;

ж) аднаасобныя гаспадаркі паўночных акраін і некаторых іншых мясцовасцей Саюза, вызваленыя па арт. 86 палажэння аб сельска-гаспадарчым падатку, гаспадаркі, пацярпеўшыя ад стыхійных няшчасцяў і з прычыны гэтага вызваленыя ад сельска-гаспадарчага падатку на 1934 г.

VII. Прадаставіць права сельскім советам вызваляць поўнасцю або часткова ад адзіначасовага падатку паасобныя маламоцныя аднаасобныя гаспадаркі. Спісы гаспадарак, падлягаючых поўнаму або частковаму вызваленню па маламоцнасці, павінны прадстаўляцца сельскім советам на зацвярджэнне раённага выканаўчага камітэта.

VIII. Раённым выканаўчым камітэтам прадастаўляецца права поўнасцю або часткова вызваляць ад адзіначасовага падатку паасобныя гаспадаркі, якія акуратна (поўнасцю і ў тэрмін) выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай па грашовых плацяжах і абавязковых паставках сельска-гаспадарчых прадуктаў.

IX. Паступленні ад адзіначасовага падатку ідуць: 75 проц. у дзяржаўны бюджэт, 10 проц. у краявыя і абласныя бюджэты і 15 проц. у раённыя бюджэты.

X. Выданне інструкцыі па прымяненню данай пастановы ўскладаецца на Народны камісарыят фінансаў Саюза ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Кремль. 26 верасня 1934 года.

ДА ЗАКУПАК ХЛЕБА У БЕЛАРУСІ

І. Ф. КУДЗЕЛЬКА

Загадчык гандлёва-совецка га аддзела ЦК КП(б)Б

На аснове пастановы Совета Народных Камісараў Саюза ССР спажыўкааперацыя БССР і Заготзярно разгарнулі работу па закупцы хлеба ў калгасах, калгаснікаў і аднаасобнікаў, выкананўшых свае абавязкі перад дзяржавай (абавязковыя паставкі і аварот пазык). На 5 верасня па БССР закуплена 376 тон, з іх спажыўкааперацыяй 206 і Заготзярно 1170 тон.

Першая авадка паказвае, што рад раёнаў паспяхова разгортвае работу па закупцы хлеба. Менскі раён купіў 451 тону, Аршанскі—661, Капыльскі—395, Жлобінскі—450, Любанскі—301, Рагачоўскі—360, Чырвона-Слабодскі—301. Ня дрэнна разгорнута работа па хлебазакупках у Віцебскім, Гомельскім, Полацкім, Баравіцкім, Уздзенскім і іншых раёнах.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што ў гэтых раёнах правільна зразумелі задачу закупкі лішкаў хлеба, што ў іх праведзена вялікая палітычна-масавая работа сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў.

У той-жа час Слуцкі раён купіў толькі 59 тон, Касцюковіцкі—37, Клічаўскі—9, Асіповіцкі — 4, Лёзненскі — 6, Лепельскі — 13, Піклоўскі—12, Мсціслаўскі—14. А якія раёны, як Чырвонапольскі, Мельчыцкі фактычна да хлебазакупак яшчэ не прыступалі. Гэта гаворыць аб тым, што, па-першае, у гэтых раёнах не зразумелі ўсёй сумы палітычных і гаспадарчых задач, звязаных з закупкай хлеба, далей разгаворў не пайшлі. Па-другое раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі гэтых раёнаў усцілі хлебазакупку на самацёк, прадаручылі гэту работу спажыўцкай кааперацыі.

«Правда» 22 верасня пісала: «Закупкі хлеба—справа вялікая і не толькі гаспадарчая, але і палітычная. Толькі безнадзейны апартуніст можа думаць, што закупкі можна ўлікам перадаверыць кааперацыі ці апарату Заготзярно. Не, за поспехі хлебазакупак адказваюць перш усё партыйныя арганізацыі і райвыканкомы советаў. Яны павінны прымусіць кааперацыю працаваць як след, яны павінны дапамагчы і заготзярно па-большэвіцку правесці закупкі хлеба».

Гэта ўказанне «Правды» павінна замяць усе партыйныя арганізацыі і кожны комуніст паасобку. Калі ўсе партыйныя арганізацыі, райвыканкомы і советы па-большэвіцку возьмуцца за закупкі хлеба, то закупкі будуць праведзены з поспехам і з большым размахам.

Ураджай гэтага года зерневых значна вышэй леташняга. Па папярэдніх падліках па калгаснаму і аднаасобнаму сектарах, ураджай гэтага года па 10 млн. пудоў больш, чым леташні, пры непараўнана лепшым якасці бульбы.

Па-другое, на атаварванне хлебазакупак адпушчана на верасень і кастрычнік квартал г. г. тавараў на 4 млн. руб., прычым значнае месца сярод гэтых тавараў займае жаночае адзенне, пікле вакоўнае, аўтамабілі, веласіпеды, на якія вялікі попыт як з боку калгасаў, так калгаснікаў і аднаасобнікаў.

З спажывецкіх тавараў завозіцца мат мануфактуры, гатовага абутку, вопраткі і інш. Неабходна пракласці, каб атаварванне праводзілася своечасова і правільна па пастаноўленаму Белкаапсаюзам пляну. Для гэтага трэба больш гібка працаваць, правільна планаваць і забяспечваць своечасовую адгрузку тавараў на базы, райсаюзы і сельпо.

Першыя дні разгортвання закупак хлеба паказалі, што з гэтай справай Белкаапсаюз спраўляецца дрэнна. Толькі зараз прымаюцца меры да знішчэння тых агрэгатных недахопаў, якія выяўлены ў пачатку закупак хлеба. Але гэтыя недахопы, трэба думаць, будуць ліквідаваны ў бліжэйшыя дні. Задача заключаецца ў тым, каб правільна арганізаваць закупкі хлеба. Для гэтага патрабуецца вялікая, цярпеная, настойлівая растлумачальная і арганізацыйная работа.

«Правда» 23 верасня пісала: «Трэба, аднак, падкрэсліць, што закупкі трэба арганізаваць. Разлікі на самацёк тут таксама шкодны, як і пры арганізацыі хлебазадачы. Трэба не толькі растлумачыць усебакова калгаснікам і аднаасобнікам выгаднасць для іх продажу хлеба дзяржаве, не толькі правесці агітацыйную работу, але і забяспечыць закупку хлеба ў кожным даным раёне поўнай сумай арганізацыйных мерапрыемстваў».

Растлумачальную работу трэба правесці ў першую чаргу сярод актыва вёсці (калгасы, сельсоветы, дзесяцідворкі), каб пры іх дапамозе мы так разгарнулі нашу растлумачальна-агітацыйную работу сярод калгаснікаў і, асабліва, аднаасобнікаў па закупцы хлеба, каб дабіцца рашучага пералому ў бок штодзённага павелічэння колькасці закупляемага хлеба.

Ні ў якім выпадку нельга дапусціць спроб голага адміністравання, а таксама весці закупкі выключна за кошт калгасных фондаў, што з'яўляецца шкоднай справай.

У такой вялікай і важнай справе, як хлебазакупкі, неабходна шырока разгарнуць соцспаборніцтва як сярод аднаасобнікаў, так і калгаснікаў.

Трэба даказаць і аднаасобніку, і калгаснику неабходнасць продажу хлеба дзяржаве. Гэта можна зрабіць тады, калі перадавыя калгаснікі і аднаасобнікі поўнасцю прададуць свае лішкі дзяржаве і па іх будуць раўняцца астатнія.

Трэба неадкладна прыняць жорсткія меры супроць спекуляцыі хлебам, бо ў радзе месц амаль адкрыта спекулянты беспакарана скупляюць хлеб. «Не сакрэт, — піша «Правда», — што некаторыя аднаасобнікі і нават калгаснікі, карыстаючыся патураннем мясцовых улад, ударыліся ў спекуляцыю. «Правда» ўжо неаднаразова паведамляла аб фактах незаконнага гандлю хлебам. Нічым апрача ліберальнымі адносінамі да спекулянтаў тлумачыць гэтыя факты нельга. Трэба з усёй строгасцю змагацца са спекулянтамі і тымі, хто ім патурае. Совецкая ўлада зможа прымусіць паважаць свае законы».

Гэта ўказанне «Правды» павінна з усёй настойлівасцю праводзіцца ў жыццё і, у першую чаргу, органамі міліцыі і пракуратуры.

У кожным раёне, сельсавеце трэба шырока давесці да ведама аднаасобнікаў і калгаснікаў цэны на зярно па культурах, парадак і памеры атаварвання; указаць пункты, дзе праводзіцца продаж тавараў за праданы дзяржаве хлеб, які ёсць асартымент тавараў; арганізаваць падвоз тавараў у вёску, калгасы, прыступіўшыя да продажу хлеба.

Раённыя партыйныя арганізацыі, РВК павінны прасачыць за недапушчэнем усякага роду скажэнняў у справе закупкі хлеба, давядзення цвёрдых планаў да калгасаў, калгаснікаў, аднаасобнікаў, даючы гэтым шкодным спробам своечасовы і рашучы адпор.

У гэтым годзе не дапусцім памылак, якія мелі месца ў мінулым годзе. Трэба прымусіць спажыўкааперацыю працаваць лепш, больш ініцыятыўна як у справе непасрэднай закупкі лішкаў хлеба, так і своечасовай расплаты і атаварвання праданага хлеба. Трэба прасачыць, каб тавары, прызначаныя на атаварванне хлеба, не былі выкарыстаны на другія мэты, што таксама мела месца ў мінулым годзе.

Зусім недапушчальна, што закуплены хлеб на пяць тысяч пудоў астаецца невывезеным з сельпо. Неабходна абавязаць спажыўкааперацыю вывезці ўвесь закуплены хлеб на пункты Заготзярно не пазней і кастрычніка і не дапусціць у далейшым скаплення загатоўленага хлеба ў глыбінных пунктах.

Партыйныя арганізацыі павінны дабіцца павелічэння пакупкі жыта і пшаніцы. Адначасова з гэтым неабходна заняцца ўзмацненнем закупкі хлеба сярод аднаасобнікаў, якія пакуль што прымаюць слабы ўдзел у продажы хлеба.

Калгас «Адказ ворагам» перавыконвае свае якасныя паказальнікі па здачы ільну. Павінен быў здаць не ніжэй 10-12 нумара, а здае 14 нумара.

НА ЗДЫМКУ: адказны па здачы ільну тав. Адэка Марыя (злева) здае лён 14-га нумара.

ТЭМПЫ ІЛЬНАЗАГАТОВАК НЕДАПУШЧАЛЬНА ЗНІЗІЛІСЯ АПОШНЯЯ ПЯЦІДНЕЎКА ДАЛА ПРЫРОСТУ УСЯГО 2 ПРОЦ.

УСЕ СІЛЫ НА ВЫСОКАЯКАСНУЮ АПРАЦОЎКУ І ХУТЧЭЙШУЮ ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ

КУЛАЦКІ САБАТАЖ НЕ СУСТРАКАЕ АДПОРУ

БЕШАНКОВІЧЫ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

На 23 верасня па Бешанковіцкаму раёну гадавы план загатовак выкананы усяго на 1,1 проц. 5 сельсоветаў — Свечанскі, Страліцгранскі, Вярхоўскі, Біклошскі і Бешанковіцкі — дагэтуль не пачыналі ручной пераапрацоўкі і здачы ільну. Буйнейшы ільнаводчы сельсавет у раёне — Усвейскі — па плану павінен здаць 350 цэнтнераў валакна, а здаў... 0,90 цэнтнераў (0,2 проц. плана). Такое-ж становішча ў Сакароўскім, Астроўскім, Новікаўскім і Макараўскім сельсветах.

Калгас «Большэвік», Сакароўскага сельсавета, па плану павінен здаць дзяржаве 218 цэнтнераў трасты і 49 цэнтнераў валакна. Трасты калгас здаў 109 цэнтнераў, а ручной пераапрацоўкі не пачынаў. Чаму?

Намеснік старшыні калгаса па ільну тав. Канапелька спасылаецца на тое, што «ёсць у нас шасціпарвальная мялка, але прывод сапсаваўся, а адрамантуем мы яго не раней 25 верасня».

Бясспрэчна, прывод сапсаваны. Але чаму праўленне калгаса своечасова не паклапацілася, каб дастаць прывод у суседніх калгасах? Проста аб гэтым не думалі. Больш таго, у калгасе было дастаткова сваіх прыводаў, але іх распрадалі, а ручныя мялкі таксама раздалі другім калгасам.

Ясней яснага, што ў гэтым калгасе мы маем справу з яўным сабатажам ільнаапрацоўкі і ільназдачы.

У калгасе «1 мая», Бачыйкаўскага сельсавета, перад мяцёнем траста не адлежваецца. У мялку ідзе гарачая траста. Яна не мяцца, а крышыцца разам з валакном. Прычым жменькі адлучаюцца буйныя. За адзін раз у шасціпарвальнай мялцы не пераапрацоўваюцца, пускаюцца ў мялку два разы, ад чаго валакно сячэцца, кудлачыцца. Адыходы вялікія. А старшыня калгаса Арлоўскі, замест таго, каб павесці барацьбу са стратамі, стаў на антыдзяржаўны кулацкі шлях, распаўсюджваючы па калгасу чуткі аб тым, што план усё роўна не выканаем. І гэта кулацкая дзейнасць не сустракае адпору з боку раённых арганізацый.

Кіраўніцтва раёна пасля пэўных поспехаў у хлебапастаўках самасупакоілася. Адказнейшы перыяд ільнапераапрацоўкі і ільназагатовак пушчая на самацёк. Бяздзейнасць раённых арганізацый скарысталі кулацкія і сабатажніцкія элементы, каб сарваць пераапрацоўку ільну і здачу яго дзяржаве.

А. МІКУЦКІ.

ЯК РАСЦЕ ВАГА ІЛЬНЯНОГА ПРАЦАДНЯ

Сёння мы адправілі на заготпункт апошнія 5 цэнтнераў валакна. З дзяржавай разлічыліся поўнасцю. План выкананы і перавыкананы як па колькасці, так і па якасці.

Мінулы год нас многаму навучыў. Мы пераканаліся, што чым вышэйшая якасць ільнапрадукцыі, тым больш прошай, больш збожжа і іншых прамтавараў атрымліваюць калгаснікі і калгасніцы.

Па кантрактацыйнаму дагавору мы абавязаліся здаць дзяржаве з 24 гектараў ільну 73,46 цэнтнераў трасты сярэднім нумарам 1,57 і 13,72 цэнтнера валакна сярэднім нумарам 9. Выходзіць, што трасты трэба было здаць 115,3 цэнтнера-нумараў і валакна—123,48 цэнтнера-нумараў.

Калі-б мы выканалі план і па колькасці і па якасці так, як запісана ў дагаворы, мы атрымалі-б за трасту 1.153 кілограмы хлеба (па 10 кгр. за цэнтнера-нумар) і за валакно—1.358 кілограм хлеба (па 11 кгр. за цэнтнера-нумар), а ўсяго—2.511 кгр.

Фактычна-ж мы здалі дзяржаве трасты 117,58 цэнтнера сярэднім нумарам 2,75, гэта значыць — 323,34 цэнтнера-нумароў. Перавыкананне звыш чым у два разы. За гэту трасту мы атрымліваем 3.233 кілограмы хлеба.

Тое-ж і з валакном. Мы яго здалі ў сярэднім 15,3 нумарам у колькасці 14,21 цэнтнера, гэта—218,68 цэнтнера-нумароў. Хлеба за валакно атрымліваем 2.405,48 кгр. Разам-жа за трасту і валакно —5.638,88 кгр.

Дык вось, ільняных працадзён у нас за год налічана 2.665. Калі-б мы разлічыліся з дзяржавай па кантрактацыйнаму дагавору, мы-б атрымалі 2.511 кгр., гэта значыць—900 грам на працадзень. Але-ж мы перавыканалі план і па колькасці і па якасці. Таму мы атрымалі 5.638,88 кгр., што складае 2 кгр. 120 грам на ільняны працадзень.

Ды гэта яшчэ не ўсё. За зданую ільнапрадукцыю мы атрымліваем яшчэ 28,15 кгр. цукру, 60,50 кгр. рыбы, за ільнасемя — 125 кгр. алею і для жывёлы 125 кгр. макухі.

Аб чым сведчыць гэты наш прыклад? Якасць ільнапрадукцыі — у нашых руках. А дзяржава не пакпуніцца: яна плаціць шчодра за высокаякасную прадукцыю.

Старшыня калгаса «ЦІМІРАЗЕВА», Немайцянскага сельсавета, Сенненскага раёна К. ЗАХАРЭВІЧ.

ГАСТАНОВА ПА РАШЭННЮ ЦК КП(б)Б, ЦО „ПРАВДА" АБ ЗАНЯСЕННІ МЕНСКАГА РАЁНА НА УСЕСАЮЗНУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

Надаючы велізарнае гаспадарча-палітычнае значэнне факту занясення Менскага раёна і зоны дзейнасці палітаддзелаў МТС на ўсесаюзную чырвоную дошку, што з'яўляецца вынікам аграмаднай творчай ініцыятывы найпярэйшых калгасных мас Менскага раёна ў барацьбе за паспяховую рэалізацыю ўказання правадыра нашай партыі тав. Сталіна аб тым, каб зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі—гэтых поспехаў і найвялікшага гонару перад прапоўнымі Совецкага Саюза калгаснікі Менскага раёна змаглі дабіцца дзякуючы актыўнай дапамозе з боку рабочых фабрык і заводаў, даўшых лепшых сваіх прадстаўнікоў для ўзмацнення кіруючага складу калгасаў праз пасылку адпаведных брыгад, арганізацыі пераходных сцягаў на асобных заводах і прадпрыемствах, дзякуючы выключнаму штодзённаму кіраўніцтву з боку ЦК КП(б)Б і асабіста тав. Гікало, з боку большэвіцкага друку, і ў першую чаргу нашай ленінскай «Праўды».

Адначасова ГК КП(б)Б, палітаддзелы з усёй рашучасцю падкрэсліваюць перад усёй партарганізацыяй, шырокімі масамі рабочых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў Менскага раёна, што факт занясення на ўсесаюзную чырвоную дошку накладае на Менскі раён выключна адказныя задачы, як правільна падкрэслена ў прывітальнай тэлеграме тав. Гікало аб пераўтварэнні Менскага раёна ва ўзорны, у вядучы раён у справе соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі БССР і адначасова гэта патрабуе ад гарадской партарганізацыі ліквідацыі тых прарываў, якія ёсць у справе выканання промфінплана па гораду.

Бюро ГК КП(б)Б, палітаддзелы МТС, оргбюро РВК і горсовет пастанаўляюць:

1. Прапрацаваць рашэнне Бюро ЦК і ЦО «Праўда» аб занясенні Менскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку на адкрытых партыйных сходах з удзелам рабочых фабрык і заводаў, у калгасах, сярод аднаасобнікаў, скарыстаўшы гэту прапрацоўку для мабілізацыі рабочых, калгаснікаў, працоўных аднаасобнікаў:—у горадзе на выкананне і перавыкананне промфінплана, на лепшую падрыхтоўку прадприемстваў к зіме з тым, каб у чацвертым квартале забяспечыць паспяховае сканчэнне выканання гадавога плана як па ўсёй прамысловасці Менскага раёна, так і ў разрэзе кожнага прадпрыемства; па калгасах—для завяршэння плана заготовак хлеба, выканання заготовак, мясапаставак, сканчэння зяблевіка, засыпкі страхавых і насенных фондаў і ўдарнай падрыхтоўкі калгасаў і калгаснікаў да зімы; сярод аднаасобнікаў—для поўнага выканання ўсіх абавязкаў перад дзяржавай і арганізацыі масавага прыліву ў калгасы.

2. Для больш дэтальнага растлумачэння значэння фактаў занясення Менскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку і шырокага канкрэтных мерапрыемстваў, выцякаючых з гэтага, лічыць неабходным склікаць 28 верасня нараду старшынь сельсветаў, калгасаў і парторгаў, прыцягваючы прадстаўнікоў фабрык і заводаў.

29 верасня склікаць нараду трыкутнікаў прадпрыемстваў горада па пытанню аб ходзе выканання промфінплана і канкрэтных абавязкаў у сувязі з занясеннем на чырвоную дошку.

3. Бюро ГК, палітаддзелы, оргбюро РВК і горсовет заклікаюць усю партыйную арганізацыю, беспартыйны актыў, рабочых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў падвоіць сваю энергію і напружыць усе сілы к таму, каб яшчэ з большым поспехам на ўсіх участках нашай работы завяршыць 1934 гаспадарчы год і падрыхтавацца к паспяховаму правядзенню важнейшых гаспадарча - палітычных мерапрыемстваў партыі ў надыходзячым 1935 годзе, увязаўшы гэта з масавым паходам імя надыходзячага з'езда Совецтаў.

Нам. сакратара Менгаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.
Старшыня Горсовета ЖУКОВІЧ.
Старшыня Оргбюро РВК ТУРЭЦКІ.
Начальнік палітаддзела першай МТС ПЛЯТНЕЎ.
Начальнік палітаддзела Большэвіцкай МТС КАМЕНШТЭЙН.

КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ АДКАЗВАЮЦЬ НА ЗАНЯСЕННЕ РАЁНА НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

ОРША, 27. (Па телефону ад карэспандэнта «Звязды»).

У адказ на занясенне Аршанскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку «Праўды», бюро райкома, райвыканком і палітаддзел МТС у спецыяльнай пастанове адзначаюць, што занясенне Аршанскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку ЦО партыі—«Праўды»—з'яўляецца фактам выключна велізарнага значэння, справай вялікага гонару ўсёй партарганізацыі, советаў і калгасаў Аршаншчыны, большэвіцкай ацэнкай поспехаў раёна і ўдарнай работы калгасаў, калгаснікаў. «Гэтыя поспехі партарганізацыя, советы і ўдарнікі Аршаншчыны, — гаворыцца ў пастанове, — атрымалі выключна ў выніку няўхільнага ажыццяўлення рашэнняў XVII з'езда ВКП(б), пленума ЦК і ўказанняў любімага правадыра тав. Сталіна аб пераўтварэнні ўсіх калгасаў у большэвіцкія, а калгаснікаў у заможных. Рашэнні з'езда і ўказанні таварыша Сталіна з'явіліся сігнам барацьбы шырокіх мас калгаснікаў і калгасніц за паспяховае выкананне важнейшых задаванняў партыі і урада ў барацьбе за перамога раёна ў рэспубліцы.

Нарэшце, калі поспехі ёсць рэзультат штодзённага апэратыўнага большэвіцкага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша Гікало.

РК, РВК і палітаддзел падкрэсліваюць, што высокая ацэнка нашых поспехаў, занясенне раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку і атрыманне пераходнага сцягу ЦК і СНК не павінна спыніць партарганізацыю, советы і ўдарнікаў на дасягнутым.

Райком, райвыканком і палітаддзел заклікаюць усіх комуністаў, комсамольцаў, калгаснікаў, калгасніц і добрасумленных аднаасобнікаў адказаць канкрэтнымі справамі, арганізацыяй магутных чырвоных абозаў імя «Праўды» з ільном, бульбай, мясам і праданым дзяржаве хлебам. Адказаць магутным уздымам тэмпаў і якасці апрацоўкі і здачы дзяржаве ільну, неадкладным завяршэннем капання бульбы, узмацненнем барацьбы ўсёй партарганізацыі, советаў і калгаснікаў за першае месца раёна ў рэспубліцы, за выкананне рашэнняў XVII з'езда партыі і наступных пленумаў ЦК аб колькасным і якасным развіцці жывёлагадоўлі; узмацненнем работы па марксісцка-ленінскаму выхаванню радоў партыі, узорнай арганізацыяй зімовай вучобы ў калгасах раёна.

РК, РВК і палітаддзел ставяць як галаўную задачу перад кожнай парторганізацыяй, сельсветам, калгасам, кожным комуністам, комсамольцам, совецкім актыўістам-ударнікамі і ўдарніцамі калгасаў:

У двухдзённы тэрмін закончыць будаўніцтва ўсіх новых аб'ектаў, свінарнікаў, абор і стайняў.

На працягу 10-15 дзён завяршыць ацяпленне ўсіх памяшканняў на зімовае стойла жывёлы і ў гэты тэрмін ва ўсіх калгасах і фермах закончыць складанне кварталных балансаў і перадачу каровы фермам.

Не спыняцца на выкананні плану зяблявага ворыва, а замахнуцца да адзінага ворыва ўсю плошчу пад вога кліну 1935 года, высокаякасна на захапаць увесь насенны матэрыял, інвентар і цягавую сілу.

Узмацніць канкрэтную абарончую работу ў калгасе. Пастаўіць бліжэйшай задачай пераўтварэнне кожнага калгаса ў крэпасць абароны.

Большэвікі-ўдарнікі Аршаншчыны заклікаюць ЦО партыі «Праўду» і ЦК КП(б)Б, што яны яшчэ больш будуць змагацца за выкананне заданняў партыі і ўрада, аддадуць усе свае сілы за справу партыі Леніна-Сталіна.

ВЫНІКІ ТОРФСЕЗОНА І ЗАДАЧЫ 1935 ГОДА

Тарфяная прамысловасць БССР 1934 годзе мае вялікія дасягненні. Аб гэтым сведчыць работа торфзаводаў сістэмы Белторфа. План торфаздабычы — 328.000 тон, а здабыта 357.000 тон, што складае 108,5 проц. супроць 70 проц. 1933 года. Упершыню Белторф прыходзіць з такімі паказальнікамі ў выкананні плана здабычы. Калі ў 1933 годзе выпрацоўка торфу на аднаго кваравага рабочага складала ў сярэднім 104 тоны ў год, то ў гэтым сезоне яна складае 157 тон, гэта значыць рост на 51 проц. Сезон здабычы торфу закончан у гэтым годзе на 10 дзён раней леташняга. Высушана і ўбрана здабытага торфу на 27 верасня 98,1 проц. супроць здабытых у 1933 годзе 50 проц. На сістэме Наркамлегпрома высушана і ўбрана 100 проц.

Павялічылася ў параўнанні з 1932 і 1933 г. г. удзельная вага механізаваных спосабаў здабычы (фрэзервы і малы гідраторф). Асабліва цікавы паказальнік работы мы маем па здабычы фрэзернага торфу. План здабычы фрэзернага торфу выканалі поўнасцю першымі па Совецкаму Саюзу. Значна лепш у гэтым годзе выкарыстаны механізмы і машыны. Выпрацоўка на адну машыну ў параўнанні з 1933 годам павялічылася на 13,5 проц. і на 25 проц. супроць 1932 года.

Гэтыя поспехі тарфяной прамысловасці дасягнуты дзякуючы штодзённаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б, СНК і асабіста тав. Гікало, выключнай увазе і дапамозе, аказанай імі тарфяным заводам.

У пачатку сезона, калі яшчэ тарфяная прамысловасць знаходзілася ў прарыве, было склікана пашыранае пасяджэнне дырэктараў і інжынераў торфзаводаў пры ЦК КП(б)Б, дзе загадчык промаддзела ЦК тав. Готфрыд паказаў, што такімі метадамі працаваць нельга. Ён гаварыў: «Ісці магчыма далей упоравае калядарнага плана, сканцэнтраваць упор на магчыма большае выкананне ў першай палове сезона». ЦК кінуў на торфзаводы лепшыя кадры, якія сваім кіраўніцтвам забяспечылі выкананне плана здабычы торфу.

Рашэнне чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б па апалу і разгорнутым на БССР вытворчым паходзе імя тав. Гікало з'явіліся мабілізуючым фактарам у выкананні плана.

У тарфяной прамысловасці вырасла армія ўдарнікаў, знатных людзей, якія сваім прыкладам заражалі ўсіх большэвіцкай работай.

Уся грамадскасць БССР ведае імёны Куранёва, Жура, Федчанка, Берасўскага, Лявоненка і іншых. Сотні тысяч тарфяніц нашай рэспублікі спаборнічалі за пярэдніцтва з лепшым брыгадзірам сушыльнай брыгады завода «Шлях соцыялізма» тав. Гарбачовай.

Тарфяная прамысловасць БССР, і ў прыватнасці заводаў Белторфа, атрымала вялікую колькасць маладых совецкіх спецыялістаў, якія паказалі большэвіцкі стыль работы. Вось імёны лепшых маладых спецыялістаў, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод тарфяніц: Фрадкіна, Пярэмскі, Сагаловіч, Львовіч і інш.

Разгорнутае соцспаборніцтва забяспечыла дэтэрміновае выкананне плана дзесяткамі тарфяных заводаў БССР. Упершыню Асінторф выканаў сваю праграму ў 160 тыс. тон на 106,64 проц., на месяц раней тэрміну, а план здабычы фрэзернага торфу на 115 проц.

Такія дырэктары заводаў, як тав. Блюм (завод імя Гея), Войкаў (Асінторф) і інш., паказалі высокія здольнасці ў арганізацыі мас на выкананне плана.

Торф у БССР з'яўляецца асноўным апалам. Тарфяная прамысловасць мае вялікія рэзервы, дзякуючы якім яна павінна працаваць яшчэ лепш. Не ўсе яшчэ ацанілі важнасць барацьбы за торф. Рад райкомаў і райвыканкомаў не аказалі дастатковай дапамогі тарфяным заводам. Старадарожскі раён павінен быў даць па плану 225 чалавек для торфазавода «Свабода», а даў 10; Расонскі раён замест 343 даў 100; Чэрвеньскі замест 331 даў 89. Сакратары перадавых РК і старшыні РВК не дапамагалі ў вярбоўцы рабочай сілы. Аршанскі раённы камітэт не аддаў належнай увагі разгортванню палітыка-масавай работы на Асінторфе, што было адзначана ў пастанове бюро ЦК КП(б)Б. У гэты-ж час Віцебскі РК КП(б)Б паслаў на Асінторф 40 лепшых комуністаў.

Задача заключаецца ў тым, каб забяспечыць вывазку торфу да фабрык і заводаў. Кожны завод, і асабліва электрастанцыя, павінны ў бліжэйшы тэрмін мець зімовы запас торфу для бесперабойнай работы.

Асабліва недапушчальным з'яўляецца дрэннае выкарыстанне фрэзернага торфу. Менская ЦЭЦ, якая па плану павінна карыстацца галоўным чынам фрэзерным торфам, не прыстасавана для гэтага. Менская электрастанцыя, дзе ёсць адпаведная ўстаноўка для спальвання фрэзернага торфу, сабатуе яго скарыстанне. Кіраўнікі БелДРЭС, якая паводле плана павінна спальваць 50.000 тон фрэзернага торфу, заявілі, што яны змогуць спаліць да 1 студзеня 1935 г. толькі 15.000 тон. Антыдзяржаўным тэндэнцыям у скарыстанні фрэзернага торфу трэба даць рашучы адпор.

Сёння трэба ва ўвесь рост паставіць пытанне аб баявой падрыхтоўцы да сезона 1935 года. А задачы стаяць вялікія. Дастаткова сказаць, што па заводах Белторфа план у 1935 г. будзе павялічан з 328 тыс. тон да 415 тыс. тон.

Першая задача — падрыхтоўка кадраў. Адных рабочых тарфяная прамысловасць Белторфа патрабуе 11500 чал. Зараз трэба, каб кожны дырэктар завода замацаваў сваю рабочую сілу, асабліва малодшы камандны склад (брыгадзіраў, матарыстаў і т. д.).

Першыя крокі па падрыхтоўцы кадраў зроблены заводам імя Гея і Асінторфам, дзе арганізуюцца курсы для рознай кваліфікацыі па 464 чал. Неабходна энергічна ўзяцца за вярбоўку рабочай сілы. Кожны завод павінен мець умовы аплаты рабочым у сезоне 1935 г.

Другой задачай з'яўляецца паляпшэнне матэрыяльна-бытавых і культурных умоў рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Урад БССР адпусціў для заводаў Белторфа 2,5 мільёны рублёў на пабудову сталовых, фабрыкі-кухні і клуба (для Асінторфа), дамоў, гароднехавалень і т. д.

Трэцяя задача — максімальнае павелічэнне механізаванага спосабу здабычы. У сезоне 1935 года вялікае месца займае фрэзерны спосаб. Уводзіцца вялікі гідраторф на Асінторфе, колькасць агрэгатаў малога гідраторфу павялічваецца з 3 да 7-мі. Упершыню на заводах БССР будзе працаваць тарфяны камбайн. Асноўная задача кіраўнікоў і рабочых тарфяной прамысловасці — у мінімальны тэрмін падрыхтаваць гэтыя новыя спосабы здабычы і найлепш іх асвоіць, каб кожны агрэгат, кожная машына дала больш торфу і лепшай якасці.

І апошняй немаловажнай задачай з'яўляецца падрыхтоўка балот (зацішка) і кар'ера.

Не марудзіць ні хвіліны. Паабольшэвіцку падрыхтавацца да сезона 1935 года!

С. РУБЕЖЫН, А. ШАПІРА.

ХЛЕБАЗАКУПКІ

БЯЗЛІТАСНА КАРАЦЬ ЗА РАЗБАЗАРВАННЕ ТАВАРНЫХ ФОНДАЎ, ВЫЗНАЧАНЫХ ДЛЯ СТЫМУЛЯВАННЯ ЗАКУПАК ХЛЕБА

ПРА ЗАКУПКІ ХЛЕБА І НЕ ДУМАЮЦЬ

Петрыкоўскі райспажыўсаюз, замест таго, каб разгарнуць салраўдную масавую работу, заняўся самастрахоўкай. Атрымаўшы дырэктыву на дазвол дзяржаўнага гандлю хлебам, ён абмежаваўся толькі тым, што спусціў гэту дырэктыву ў сельпо. Ці прыступіла сельпо да закупкі хлеба, ці не — гэтым райспажыўсаюз не цікавіцца.

Райспажыўсаюз нават не ведае, што гарпо, якое знаходзіцца побач, да закупкі хлеба не прыступіла. У гарпо да гэтага часу няма памяшкання для хлеба.

З прыбыўшых на базу райспажыўсаюза трох веласіпедаў для стымулявання закупак хлеба старшыня райспажыўсаюза Ліўшыц адзін забраў сабе, другі аддаў райзагу, а трэці нейкаму знаёмаму.

Ігнараванне дырэктыў урада аб закупцы хлеба, прысвойванне тавараў, прызначаных для стымулявання сведчыць, што ў Петрыкаўскім райсаюзе і гарпо працуюць людзі не нашы, ім там не павінна быць месца. Мы патрабуем, каб пракурор раёна неадкладна ўзяўся за гэту справу і над вінаватымі ў разбазарванні фондаў стымулявання закупак хлеба быў арганізован грамадска - паказальны суд.

С.

СЛЕДУЮЦЕ ПРЫКЛАДУ ТРАКТАРЫСТАЎ СТАРОБІНСКАЙ МТС

Першая брыгада трактарыстаў Старобінскай МТС, прэміраванай палітсектарам Наркомзема, у адказ на пастанову ўрада аб дазволе дзяржаўнага гандлю хлебам прадала дзяржаве дзве тоны жыта. Брыгада выклікала паследаваць яе прыкладу астатнія брыгады і спаборнічаючых з імі трактарыстаў Танежыцкай МТС.

ПАЛІЧАНСКІ.

АКТЫЎ г. МЕНСКА АБГАВАРВАЕ ВЫНІКІ ЎСЕСАЮЗНАГА З'ЕЗДА ПІСЬМЕННІКАЎ

НОВАЯ СТУПЕНЬ культурнай рэволюцыі

ВЫВУЧАЦЬ УСЮ МНОГАГРАННУЮ СКЛАДАНАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

З прамовы народнага паэта рэспублікі т. Я. КОЛАСА

Калі гаварыць аб першым усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў, то значыць гаварыць аб вялікай радасці, гаварыць аб трыумфе культурнай рэволюцыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Калі я цяпер успамінаю аб гэтым з'ездзе, то ў маіх вачах устае Масква, на маскоўскія маштабы, Пярэгожкны Дом саюзаў, а калі гэтага дома ўвесь час цесным натоўпам стаяць людзі: адны для таго, каб увайсці ў зал, а другія проста для таго, каб паглядзець пісьменнікаў.

У самім-жа зале праходзіць цэлы рад далярытых, выдатных прыкіх фігур дакладчыкаў, як Максім Горкі, Карл Радэк, Бухарын. Па прыбуцце з'яўляюцца прадстаўнікі нацыянальных літаратур. Яны гавораць аб сваіх дасягненнях, аб пройдзеным шляху на літаратурным фронце, аб класавым змаганні і аб тых задачах, якія перад імі стаяць.

Задачы-ж усіх таварышоў пісьменнікаў аднакія, усе зацікаўлены ў тым, каб даць такую прадукцыю, якая-б сапраўды адпавядала нашай гераічнай эпосе.

На гэтай-жа трыбуне праходзіў цэлы рад пісьменнікаў з Захаду і з Усходу.

Калі совецкія пісьменнікі гаварылі ноўным голасам аб тых шырокіх прасторах, аб тых шырокіх магчымасцях, якія дае яму — совецкаму пісьменніку, совецкая рэчаіснасць, то зусім іншы гучэлі галасы прадстаўнікоў рэволюцыйнай літаратуры Захаду і Усходу.

На трыбуне з'яўляліся многія делегацыі ад розных арганізацый для таго, каб пітаць першы ўсесаюзны з'езд пісьменнікаў. На трыбуне праходзілі ветэраны палітычнага змагання. На трыбуне праходзілі ветэраны грамадзянскай вайны, дзеці, калгаснікі, рабочыя, словам, сотні людзей. Усе яны — прад'яўлялі нам, совецкім пісьменнікам, свой, так сказаць, рахунак. Усе яны патрабавалі даць сапраўднага чалавека, даць будаўніка нашага жыцця, будаўніка новага, бясклясавага грамадства.

Я-б, таварышы, прызнаючы ўсю законнасць гэтых патрабаванняў, унёс-бы невялічкую толькі папраўку. Калі-б мне даводзілася рабіць заказ пісьменніку, паказаць чалавека-барацьбіта за справу соцыялізма, то я ў першую чаргу сказаў-бы яму найсці на прадпрыемства і не толькі абмежавацца тым, каб паглядзець на яго з птушынага палёту, бо так мы жыццё не пазнаем, так мы не можам даць поўнацэнны мастацкі вобраз героя нашай эпохі. Для таго, каб даць гэты вобраз, пісьменнік павінен вывучыць яго ва ўсёй многагранай складанасці жыцця, павінен прасякнуцца яго інтарэсамі, яго бытам, яго патрэбнасцямі, яго радасцямі, смуткам і надзеямі. Калі пісьменнік не будзе мець у сваім арсенале глыбокага, усебаковага пазнання жыцця і аб'екту сваёй творчасці, то ён не можа даць поўнакроўны, поўнацэнны мастацкі вобраз таго чалавека, якога справядліва патрабуюць чытачы ад совецкага пісьменніка.

Што, таварышы, характэрнага было на гэтым з'ездзе, што асабліва кідалася ў вочы? Характэрна было тое, што гэты з'езд быў надзвычай агорнуты любоўю, увагай як з боку партыі, так і з боку шырокай совецкай грамадскасці.

Калі гаварыць аб тым, які ва мне персанальна астаўся след ад гэтага з'езда, то я-б сказаў, што ўся мая ранейшая работа, уся прадукцыя, якую я даў, яна мне паказалася ў маіх уласных вачах надзвычай малазначнай, і мне хочацца даць нешта большае, нешта лепшае, нешта такое, што сапраўды чыталася-б з захапленнем і мабілізавала-б нас на далейшае змаганне за справу соцыялізма. Такі-ж след, я ўпэўнен, астаўся і ў кожным удзельніку першага ўсесаюзнага з'езда пісьменнікаў.

ЛІТГУРТКІ—КРЫНІЦА НОВЫХ ЛІТАРАТУРНЫХ СІЛ

З прамовы рабочага фабрыкі „Окцябр" тав. ЗЕЛІКМАНА

Мы маем магутны рост і ўмацаванне нашай совецкай літаратуры. З аднаго боку ўліліся ў совецкую літаратуру новыя кадры маладых пісьменнікаў, якія выплі з шырокіх рабочых мас і ўзяліся з вялікім энтузіязмам за літаратурную справу. З другога боку ўпішчым нуюпадыйшлі да нас, да пролетарыята, лепшыя сілы старой літаратуры.

Але, не гледзячы на вялікія дасягненні літаратуры, мне хочацца і пакрытыкаваць нашых пісьменнікаў. Не ўсе пісьменнікі дасягнулі такой вышыні, каб кніга прыцягвала чытача, зацікавіла яго так, што нельга ад яе адарвацца.

Кульбак гаварыў нам аднойчы, што калі ён пісаў апошнюю паэму, ён не думаў, што ён рабочы пісьменнік і таму яму даруюцца ўсе хібы твору, але ён думаў аб тым, што павінен напісаць для шырокіх мас, каб рабочыя і працоўныя яго разумелі. Вось гэта вельмі правільна.

Літаратурныя гурткі, якія існуюць у нас, маюць вялізныя дасягненні. Гэта бясспрэчна. З гэтых гурткоў выраслі новыя імёны ў нашай літаратуры, як Рэўзін, Швэдзік, вырас Кацовіч, які ўзяўся за такую важную і цяжкую галіну літаратуры, як драматургія.

У нас на фабрыцы «Окцябр» існуе літаратурны гурток, які працуе ўжо доўгі час. Мы маем такіх членаў літаратурнага гуртка, якія ўжо не адзін раз друкавалі свае творы — Рохлін, Чарніцкі, Свірыноўская.

Мы патрабуем ад совецкіх пісьменнікаў узмацніць работу літаратурных гурткоў, бо не трэба забываць, што літаратурны гурток з'яўляецца сапраўднай крыніцай, з якой трэба чэрпаць новыя сілы для нашай совецкай літаратуры.

З'ЕЗД ІНЖЫНЕРАЎ ЧАЛАВЕЧЫХ ДУШ

З даклада нам. старшыні праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі тав. АЛЕКСАНДРОВІЧА

Новы этап совецкай літаратуры

Першы пісьменніцкі з'езд з'яўляецца падзеяй сусветнага значэння, і радзіна аб гэтым гаварыць таму, што з'езд адбыўся і мог адбыцца толькі ў Совецкім Саюзе, толькі дзякуючы кіраўніцтву комуністычнай партыі і асабіста тав. Сталіна. Тав. Сталін сістэматычна клапаціўся кіраваў справай літаратурнага руху. Ніхто іншы, як тав. Сталін, сфармуляваў сутнасць метаду совецкай літаратуры, сутнасць соцыялістычнага рэалізма, ніхто іншы, як тав. Сталін, ахарактарызаваў пісьменнікаў народаў Совецкага Саюза «інжынерамі чалавечых душ», раскрыў вялікія рэволюцыйныя перспектывы совецкай літаратуры.

Усесаюзны з'езд пісьменнікаў адкрыў новы пісьмарычны этап у барацьбе за стварэнне новай культуры соцыялізма. І гэта новая культура соцыялізма загаварыла магутным голасам у дакладзе Алексея Максімавіча Горкага, у дакладах аб літаратуры брацкіх рэспублік, загаварыла магутнай сілай інтэрнацыянальнага адзінства, сілай пролетарскай дружбы народаў на славу партыі большэвікоў.

Пісьменнікі прышлі на свой выдатны з'езд з вялікімі творчымі поспехамі, маналітна спаяныя адзнымі задачамі, адной ідэйнасцю. Гэта адзінства мэты, глыбока і кроўна ўсвядомленае пісьменнікамі ўсіх народаў Совецкага Саюза, падкрэслівае велізарнае значэнне з'езда, як дэманстрацыі адзінасці шырокіх мас совецкай інтэлігенцыі ідэям соцыялізма, як яркі паказ перамог генеральнай лініі партыі.

— У Совецкім Саюзе, як на з'ездзе выказаўся адзін таварыш, наша партыя дала пісьменніку ўсё, абсалютна ўсе правы і не дае пісьменніку адзнаго толькі права — права дрэнна пісаць. Пад знакам барацьбы за якасць мастацкай літаратуры, на аснове лініі соцыялістычнага рэалізма, мы павінны даваць творы розныя па сваіх прыёмах, розныя па мастацкіх сродках, але адноль кавыя ў сваім імкненні, па сваёй класавай накіраванасці.

Поспех усёй рэспублікі, усёй КП(б)Б

Літаратура Совецкай Беларусі вышла на з'езд з немалым творчым здабыткам. Што БССР атрымала ў літаратурную спадчыну? Вельмі небагата. Асноўны не ўздым, рост і росквіт адбываецца выключна ў гады пролетарскай рэволюцыі.

Літаратура Совецкай Беларусі — гэта творчая работа, новыя кнігі Купалы, Коласа — гэтых буйных майстроў слова, якія сёння, дзякуючы кіраўніцтву партыі, цвёрда стаяць на платформе совецкай улады, дзейна ўключыліся ў барацьбу за соцыялістычнае будаўніцтва.

Літаратура Совецкай Беларусі — гэта раманы, аповесці, паэмы і вершы Лынькова, Галавача, Чарота, Крапівы, і Бядулі, Броўкі, Хведаровіча, Глебкі і Знамага, Чорнага, Гурскага, Мікуліча і Кулешова і цэлага раду іншых таварышоў.

Літаратура Совецкай Беларусі — гэта творчасць яўрэйскіх пісьменнікаў Харыка і Кульбака, Тэйфа, Камянецкага і іншых, гэта творчасць польскіх пісьменнікаў Кавальскага, Гараўскага, Рамановскай і іншых.

Гэта вялікі дружны многагалосы калектыў — ён народжан ў агні пролетарскай рэволюцыі, у барацьбе рабочага класа за будаўніцтва соцыялізма. Маналітнасць, імкненнасць, дружба, кансалідацыя дасягнуты дзякуючы ўпартай рабоце пісьменнікаў-комуністаў на літаратурным фронце, якія сваім ідэйным і творчым ростам заваявалі права быць у першых шэрагах радах.

Выступленні нашых беларускіх дэлегатаў на з'ездзе, на заводах і фабрыках, у Зялёным тэатры, дзе прысутнічала звыш 20.000 рабочых горада Масквы, нашла сустрэча з членамі Палітбюро ЦК у Максіма Горкага, з адказнымі работнікамі «Праўды», потым наша пісьмо прадвадыру і настаўніку, лепшаму другу совецкай літаратуры — Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну — гэта не толькі нашы заявы, гэта не толькі наш поспех, гэта поспех працоўных усёй нашай рэспублікі, гэта поспех партыі большэвікоў Совецкай Беларусі.

Расце культурнасць шырокіх мас

Сіла і значэнне з'езда настолькі вялікія, што сіла зацікаўленасці ім ніколькі не аслабла і зараз.

Рост культуры шырокіх мас бясспрэчны. Гэта відаць па той чытабельнасці кніг у нашых бібліятэках, калі, каб атрымаць для чытання добрую кнігу, утвараецца чарга. Гэта відаць у нашых тэатрах, калі на добры спектакль цяжка атрымаць білет, гэта відаць у нашых кінотэатрах, калі поўным-поўна валіць народу на добры фільм, гэта відаць па сетцы нашых школ і па характару клубнай работы. Расце масавы літаратурны рух, вялікая цяга моладзі ў літаратуру.

На буйных прадпрыемствах у нас ёсць літаратурныя гурткі. Па пічырасці сказаць, гурткі нашы працуюць яшчэ вельмі і вельмі дрэнна. Ім не дапамагаюць так, як гэта трэба.

Галоўным чынам, мы павінны падкрэсліць, што работу літгурткоўцаў недаацэньваюць нашы партыкомы і фабкомы на прадпрыемствах. Часамі работа літаратурных гурткоў не ўключаецца ў агульны план работы завода. Літгуртку няма той увагі, якая аддаецца любой іншай грамадскай арганізацыі на прадпрыемстве. А мы павінны дабіцца таго, каб старшыня фабкома, робячы справаздачу перад рабочымі аб рабоце мопраўскай ячэйкі, аб рабоце Асоавіяхіма, — у такой-жа ступені адказваў за работу літаратурнага гуртка.

Калі мы работу так паставім, мы будзем мець у нашай літаратуры і ў бліжэйшыя часы новых прадстаўнікоў, талантлівых, з гушчы рабочага класа.

За высокую культуру мовы

Мы ў Совецкай Беларусі за гады пролетарскай рэволюцыі дасягнулі такіх вялікіх заваяванняў, для якіх проста нельга знайсці крытэрыя для таго, каб параўнаць з тым, што было.

Мы зараз у Совецкай Беларусі за адзін год выдаем у 16 раз больш кніг, чым выдана на беларускай мове за ўсё стагоддзі да Окцябрскай рэволюцыі ўсімі выдавецтвамі і ўсёмі краінамі. Гэта вялікі паказальнік нашага культурнага росту.

Беларускія нацдэмы шкодзілі на ўсіх участках нашага жыцця. Яны ўсюды імкнуліся падрываць фундамент соцыялістычнага будаўніцтва. Шкодзілі яны і на фронце літаратуры і мовы. Пад кіраўніцтвам нашай партыі мы з усёй ярасцю змагаліся з беларускай контррэволюцыяй і ў гэтай барацьбе нашы кадры ідэйна ўмацаваліся.

У мінулым годзе спецыяльнай пастановай СНК у Совецкай Беларусі ўведзен новы правапіс. Гэта вялікі паказальнік нашага росту, нашай крапасці. Новы правапіс з'яўляецца дэманстрацыяй таго, што мы ствараем сваю культуру пад сцягам пролетарскага інтэрнацыяналізма, гэта з'яўляецца паказальнікам таго, што мы пад кіраўніцтвам партыі будуем новую беларускую совецкую культуру.

Аднак, некаторыя недаацэньваюць гэтага сур'ёзнейшага, буйнейшага факта і не хочуць авалодаць новым правапісам (хоць ён і вельмі нескладаны) і часта пішуць зусім няграматна. Мы з'яўляемся перадавымі людзьмі, а часта пішам няграматна, часта гаворым няграматна, не сочым за сваёй мовай. Калі гаворыш на рускай мове, то трэба гаварыць абсалютна граматна па-руску, а калі гаворыш на беларускай мове, то трэба гаварыць абсалютна правільна па-беларуску. Гэта патрабаванне зусім законна пастаўлена перад намі і ўсе мы павінны змагацца за культуру і далейшае ўдасканаленне мовы.

У канцы свайго даклада тав. Александровіч прыводзіць рад яркіх фактаў, сцвярджаючых неабходнасць рашуча змагацца за культуру, яшчэ шырэй і глыбей разгортваць фронт ленінскай культурнай рэволюцыі.

На сходзе актыва, апрача тт. Александровіча, Якуба Коласа, Лынькова, Галавача і Зелікмана, вытрымкі з прамоў якіх мы даем у гэтай старонцы, выступалі тт. Дунец, Козляк, Свірыноўская.

У канцы схода з вялікай прамовай выступіў загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б тав. КОНІК.

ЛЮСТРА КУЛЬТУРНАСЦІ НАШАЙ КРАІНЫ

З прамовы пісьменніка тав. ЛЫНЬКОВА

З'езд пісьменнікаў быў агорнут найвялікшай увагай, найвялікшай любоўю з боку самай шырокай пролетарскай грамадскасці, комуністычнай партыі, совецкай і партыйнай прэсы. Ён быў не толькі паказальнікам росту нашай літаратуры, не толькі паказальнікам росту атрадаў літаратуры нашых брацкіх рэспублік. З'езд пісьменнікаў па сутнасці адлюстроўваў аграмаднейшы рост культурнасці нашай краіны, нашай большэвіцкай культуры, той культуры, якая на сёння апракідвае на абедзве лапаткі стары, драхлеючы капіталістычны свет і зацвярджае наш новы дзень, дзень соцыялізма.

Вось выступленне адной з работніц тэкстыльнай фабрыкі. Яна заяўляла:

— «Вы, таварышы пісьменнікі, не павінны адрывацца ад рабочага класа, бо вы без нас ніяк не можаце абыйсціся. бо перастанеце быць пісьменнікамі, перастанеце быць тымі, якія змогуць даць нам высокаідэйныя, высокамастацкія творы».

І мы прынялі гэта не як праяўленне своеасаблівага рабочага чванства, бо потым гэтая-ж работніца сказала нам, што «і мы без вас не абыйдземся». Вось гэтыя словы гаворыць нам аб своеасаблівым уведамленні шырокімі рабочымі масамі сутнасці нашай эпохі.

Возьміце выступленне адной калгасніцы—старшыні падмаскоўнага калгаса. Яна прад'яўляла цэлы рад патрабаванняў нашым пісьменнікам, яна гаварыла, каб нашы пісьменнікі звярталі больш увагі на жанчыну-калгасніцу. Зноў-такі гэта выступленне не было звычайным патрабаваннем цісаць аб жанчыне. У гэтым выступленні калгасніца падрабязна спынялася на розных мастацкіх творах і паказала сапраўднае знаёмства сваё з найлепшымі творамі нашай совецкай літаратуры.

Вось у чым вышыня гэтых выступленняў і прывітанняў.

Аналагічныя гэтым мы мелі выступленні на цэлым радзе гомельскіх і іншых фабрык і заводаў, дзе мы за апошнія дні праводзілі сходы, прысвечаныя з'езду.

Работніца добрушскай фабрыкі, былая беспрытульная, якая сёння з'яўляецца загадчыцай адзнаго з адказнейшых участкаў, прад'явіла нам рад патрабаванняў, як мы па вінны ў мастацкіх вобразах паказаць жанчыну сённешняга дня. Другая работніца той-жа добрушскай фабрыкі выступіла з калкратнай крытыкай адзнаго з нашых беларускіх твораў. Яна гаварыла, што мы яшчэ паказваем жанчыну вельмі абмежавана, паказваем у вузкім колеры асабістых, індывідуальных перажыванняў, а не паказваем яе месца і ролю ў калектыўнай працы, не паказваем, як наша жанчына на той-жа добрушскай фабрыцы прымае актыўны ўдзел у барацьбе за перамогі, у палепшанні вытворчасці. Рабочыя Добрушскай фабрыкі ў гонар 1-га ўсебеларускага з'езда пастанавілі выпусціць дадаткова да гадавіны Окцябра некалькі дзесяткаў тон першакласнай паперы, для таго, «каб было досыць мастацкіх кніжак у рабочых бібліятэках, у рабочага чытача».

Усе гэтыя з'явы наглядна гавораць нам аб тым, што наш з'езд зацікавіў самыя шырокія масы працоўных пытаннямі культуры і літаратурнага руху. І праў быў Нікалай Фёдаравіч Гікала, які ў гутарцы з намі сказаў, што наш з'езд з'яўляецца па сутнасці новай ступенню ленінскай культурнай рэволюцыі ў нашай краіне.

ЛЕПШЫЯ ПІСЬМЕННІКІ ЗАХАДУ І УСХОДУ ІДУЦЬ ДА БЕРАГОЎ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

З прамовы пісьменніка тав. ГАЛАВАЧА

Да 23 красавіка 1933 г. асноўныя кадры пісьменніцкай інтэлігенцыі зрабілі рашучы паварот ад старога да нас і пастанова ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1933 г. з'яўляецца палагульненнем цэлага этапу ў развіцці совецкай літаратуры, этапу, на якім пролетарская совецкая літаратура канчаткова заваявала ўсё самае лепшае, што было ў асяродзінчы старой літаратурнай інтэлігенцыі.

Але з намі, з соцыялістычнай культурай не толькі ўсё самае лепшае, што было ў асяродзінчы старой рускай, беларускай ці украінскай літаратурнай інтэлігенцыі, а і ўсё самае лепшае, што ёсць у асяродзінчы інтэлігенцыі Захаду.

Крыкі, які ахапіў усе капіталістычныя краіны, і актывізацыя фашызма, з аднаго боку, і няўхільны гаспадарчы і культурны рост СССР, з другога, паралізілі шырокі рух інтэлігенцыі, якая парывае з капіталізмам і прыходзіць да берагоў рэволюцыі.

Дзве кнігі, якія з'явіліся не так даўно, сведчаць пра тое, чым жывее сёння інтэлігенцыя Захаду, што яна з кожным днём усё больш і больш набліжаецца да пролетарскай рэволюцыі. Гэта кніга Луі Селіна — «Падарожжа на край ночы» і кніга Андрэ Мальро — «Умовы чалавечага існавання».

Праўда, кнігі неаднолькавыя. Кніга Селіна — гэта кніга страснай ненавісці да капіталізма, кніга праклёнаў капіталізму, але гэта і кніга адчаю, кніга разгубленасці. Ненавідзячы ўсёй істотай капіталізм, праклінаючы яго, Селін не бачыць яшчэ выхаду. Кніга Селіна сведчыць пра тое, што частка інтэлігенцыі блізкарукая яшчэ ў шуканнях выхаду, не бачыць яго, не верыць ужо ў сілы капіталізма, хоць і не парывае з ім.

Кніга Андрэ Мальро — іншая. Адлюстроўваючы Шанхайскае паўстанне ў красавіку 1927 г., кніга Мальро прасякнута палкім спачуваннем кітайскай рэволюцыі. Мальро шукае і бачыць ратункі на шляхах рэволюцыі. Ён становіцца ў баявыя рады. А шлях Мальро—гэта шлях усяго самага лепшага, што ёсць у асяродзінчы інтэлігенцыі, людзей мастацтва Захаду і не толькі Захаду. Сведчанне гэтаму — выступленні на з'ездзе японскага пісьменніка Хідзімата, кітайскай пісьменніцы Ху-Лань-чы, французаў Андрэ Мальро, Жана-Рышара Блока і цэлага раду пісьменнікаў іншых заходне-еўрапейскіх краін і краін Далёкага Ўсходу.

З тым, як над гарызонтам капіталістычнага свету ўсё больш чотка вымалёўваецца цень фашызма, які рыхтуе чалавецтву новую сусветную бойню, адбываецца рашаючае размежаванне і ў рядах буржуазнай інтэлігенцыі. Праўда, ёсць на Захадзе літаратары, якія не саромяцца называць сваё імя з фашызмам, якія прабуюць прыстасаваць туманістычнае словаблудзіе да новых умоў. Але не з імі лепшыя. Лепшыя з пісьменнікаў Захаду і Ўсходу ідуць да берагоў пролетарскай рэволюцыі і звязваюць сваё імя з камунізмам, каб змагацца поплеч з рабочым класам.

Думкі аб з'ездзе

ЗАХАРАЎ
Рабочы завода імя Мяснікова

ВЫРАС НОВЫ ЧЫТАЧ

Наша партыя і ўрад садзейнічаюць прасоўванню кнігі ў самыя глыбокія слаі рабочых і сялян, чаго безумоўна няма ні ў адной капіталістычнай дзяржавы. Нашы кнігі выходзяць у такіх вялікіх тыражах, што выклікаюць здзіўленне за мяжой. Але фразам з тым НІ Ў АДНОЙ КРАІНЕ НЯМА ТАКОГА ВЯЛІКАГА ПОПЫТУ НА КНІГУ. Кніг у нас не ня кніг у масах рабочых, можна прывесці наш завод імя Мяснікова. У нас ёсць свая бібліятэка, кнігі якой ні мінуты не аставацца на паліцах. Кожны рабочы ў часе абеду і пасля работы пішуць свайм абазнакам наведаць бібліятэку і атрымаць кнігу. У нас усе з'яўляюцца чытачамі бібліятэкі.

Гэты факт ускладае асаблівую адказнасць на пісьменнікаў. Маючы такіх актыўных чытачоў, трэба пісаць праўдзіва і добра. ТРЭБА ПІСАЦЬ ДАСТОЙНА НОВАГА ЧЫТАЧА.

В. ВОЛКАЎ
Мастак

ВЯДУЧЫ АТРАД СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

Работніні выяўленчага мастацтва не маглі не сачыць самым уважлівым чынам зэ ходам з'езда пісьменнікаў. Гэта быў з'езд маладой расцучай і квітнеючай культуры нашай соцыялістычнай радзімы, ён паказаў шляхі работнікам УСІХ РОДАЎ МАСТАЦТВА.

Шмат трэба нам, мастакам, павучыцца ў пісьменнікаў і арганізаванасці, і ўменню нападзіць і ўзняць на вялікую вышыню работу свайго саюза.

Мастак цесна сутыкаецца з пісьменнікам у рабоце над афармленнем яго кніжкі. Я лічу, што чым глыбей і арганічнай будзе іх сувязь, тым каштоўней будзе работа. Ілюстрацыя ў кнізе павінна як-бы дапаўняць моўны яе матэрыял, а мясцамі нават служыць далейшаму раскрыццю думкі, таго або іншага пачання аўтара.

ШАЛОНІНА
Студэнтка КІЖ

КНІГАЙ РЫХТАВАЦЬ БАЙЦОЎ БУДУЧАГА

Са з'ездаў совецкіх пісьменнікаў мне асабліва спадабалася выступленне Максіма Горкага, у якім ён гаварыў, што нашым дзецям патрэбна добрая, жывая літаратура. Мне самой зараз ужо 35 год. Я член партыі з 1918 года, я прайшла скрозь грамадзянскую вайну. Але і на 35-м годзе адчуваю, што я не стара, што я яшчэ здольна даць многа карысці нашай соцыялістычнай будоўлі,—і пойшла займацца ў КІЖ.

Я люблю чытаць Горкага, Гладкова, Шолахава і я думаю, якім магло-б быць маё жыццё, калі-б я з маленства пазнала тое, што я магу пазнаваць толькі зараз! Таму трэба нам АСАБЛІВА КЛАПАЦІЦЦА АБ ДЗЕЦЯХ і даць дзецям добрую кнігу, якая-б рыхтавала з іх узброеных ведамі нязломных байцоў будучага.

Праф. БАХЦЕЕЎ
Дырэктар інстытута торфу БелАН

ДГОЖКІЖЫ, ЯКІЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ ЗДАРОВАЕ БРАЖЭННЕ ДУМАК

Першы ўсесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў паказаў, што маладая совецкая літаратура і маладыя совецкія пісьменнікі стаяць на правільным шляху. Рэволюцыйныя пісьменнікі ўсяго свету на з'ездзе захапляліся цеснай згуртаванасцю сям'і пісьменнікаў і чытачоў у СССР. Яны захапляліся героямі будаўніцтва соцыялізма, сапраўднымі героямі, таму, што па словах Карын Міхаэльс, СССР ПРАЦУЕ ЗА ЎСЁ ЧАЛАВЕЦТВА.

Разультаты з'езда вельмі вялікія і не падаюцца пакуль учоту. Гэта дрожджы, якія выклікаюць здаровае бражэнне мыслей аб перабудове жыцця ва ўсім свеце і дапамогуць праклясці пасля шляхі да ўдасканалення асобы, але не індывідуальнай, а калектыўнай.

КАЛІНІН
Чырвонаармеец Н-скага палка

НАША ЖЫЦЦЁ ВЫДАТНЕЙ УСЯГО

Нядаўна я здаў літаратурны мінімум па вядомаму ў арміі загаду, падпісанаму тав. УБАРЭВІЧАМ. Мінімум і першы з'езд союза совецкіх пісьменнікаў выклікалі ў нашым палку яшчэ большую зацікаўленасць да сваёй літаратуры. Мяне напрыклад, больш за ўсё цікавіць мастацкая літаратура на абарончыя тэмы. Але гэту літаратуру я не магу атрымаць. Асабліва прыкра, што ў мінімум мы не змаглі ўключыць ніводнага твору нашых беларускіх совецкіх пісьменнікаў на абарончыя тэмы.

А наша жыццё выдатней за ўсё! Прыязджайце да нас у полк, таварышы пісьменнікі, і вы ўбачыце кіпучую моладасць, якая хоча пець песні разам з намі.

Забастоўка шанхайскіх рыкшаў



Шанхайскія рыкшы абвясцілі забастоўку, патрабуючы ад уладнікаў калясак зніжэння дракгнай платы.
НА ЗДЫМКУ: рыкшы знімаюць шыны з калясні штрайкбрэхера.

БУЙНЫЯ ПОСПЕХІ КОМПАРТЫІ ШВЕЙЦАРЫІ

ВЕНА, 26 верасня. (БЕЛТА) Як паведамляюць з Швейцарыі, арганізаваны соцыял-дэмакратамі 3 верасня «дзень працы» прайшоў пад знакам буйных поспехаў компартыі, якая заклікала рабочых дэманстраваць пад лозунгамі адзінага фронта, на барацьбу супроць фашызма і рэакцыйнай палітыкі швейцарскага ўрада.

У Базелі некалькі тысяч рабочых дэманстравалі пад лозунгамі компартыі і рэвалюцыйнай профсаюзнай апазіцыі. У часе соцыял-дэмакратычнага сходу, па трабаванню рабочых, з афіцыяльнай трыбуны выступіў комуністычны дэпутат, прамова якога мела вялізарны поспех. Пасля бесперапынных спроб соцыял-дэмакратычных кіраўнікоў сарваць сход жа сход была запрошана паліцыя, нападаючая на рэвалюцыйных рабочых. Збіта многа рабочых.

У Цюрыху ў дэманстрацыі удзельнічала каля 20 тыс. чалавек.

ЗАБАРОНА ПРОДАЖУ МАРКСІЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў АЎСТРЫІ

ВЕНА, 26 верасня. (БЕЛТА). Забаронен продаж твораў па марксізму і рабочаму руху. У прыватнасці — «Капітал» Маркса, «Жыццё Карла Маркса» Мерынга, «Гісторыя рабочага руху ў Англіі» Ласаля. Таксама забаронен продаж раманаў совецкіх пісьменнікаў.

ГЕРМАНІЯ ЛІХАМАНЧАВА РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЙНЫ

ПАРЫЖ, 26 верасня. (БЕЛТА). «Зр нувель» указвае на лихаманкавую закупку Германіяй бавоўны, прадназначанай для вырабу выбуховых матэрыялаў. — З усіх —бакоў, піша газета,—прыходзяць весткі, якія гавораць аб тым, што калі Германія не гатова да вайны цяпер, то яна будзе гатова да яе ў студзені наступнага года.

САКРЭТНАЯ СУСТРЭЧА ШАХТА З ДЭТЭРДЫНГАМ

ВЕНА, 25 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Берліна, у раёне Шварцвальда адбылася сакрэтная сустрэча старшыні рэйхсбанка Шахта з адным з галоўных фінансавых апекуноў нацыянал-соцыялістскай Германіі Дэтэрдынгам. Перадаюць што Дэтэрдынгу абяцаны манапольныя правы па збыту нафты, калі ён дабіцца атрымання крэдытаў Амерыцы для закупак сыравіны прамысловага абсталявання. Дэтэрдынг абяцаў пасрэднічаць паміж германскім урадам і амерыканскім банкамі.

„ПЕРАВЫШАЕ УСЕ УЯЎЛЕННІ АБ ЦЯЖКІХ ВЫНІКАХ ТАЙФУНА"

ТОКІО, 27 верасня. (БЕЛТА). Газеты «Асахі» і «Ніці-ніці» прыводзяць інтэрв'ю міністра ўнутраных спраў Гото, які робіць аб'езд раёна разбурэння. Паводле слоў Гото, асабістае азнаямленне перавышае ўсе ўяўленні аб цяжкіх выніках няшчасця, у якім апынулася Заходняя Японія з прычыны пранёсшагася над ёй тайфуна. Усе газеты адзначаюць, што начаўшыеся 26 верасня ліўні пагоршылі становішча 100 тыс. чалавек у Осака, пазбаўленых памяшкання.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

Ваенны міністр Японіі Хаясі ў бліжэйшыя дні выязджае ў Заходнюю Японію для азнаямлення са становішчам у ваенных часцях у раёне няшчасця, выкліканага тайфунам.

Праездам у Скандынавію ў Гельсінгфорсе (Фінляндыя) спынілася совецкая пісьменніца Вера Інбер. Газеты перадаюць змест зробленага Інбер у часе прыёму ў паўпрэдстве даклада аб дасягненнях совецкай літаратуры і аб выніках з'езда совецкіх пісьменнікаў.

У Мароко пражывае старэйшы ў свеце чалавек — Ласі Бен-Маці. Яму 146 год. Паводле слоў газет, ён быў 14 раз жанат, меў 34 дзяцей, з іх 12 (старэйшаму 90 год) жывы да гэтага часу. Ён харчуецца галоўным чынам фруктамі і малочнымі прадуктамі.

НАВУКА І ТЭХНІКА

Скарыстанне даламіта ў вытвор часці фібраліту

Фібраліт, прыгатаўляемы з драўлянай шэрсці і стружак на цэменце «Сорэля», з'яўляецца новым відам будаўнічага матэрыяла, выпушчаным СССР у 1929 г.

Эфектыўнасць і высокая якасць фібраліта, як матэрыяла для перагародак і перакрыцця, выклікалі за апошнія гады рост яго вытворчасці. Аднак, выраб фібраліта ў шырокіх размерах сустракае перашкоды з прычыны таго, што каустычны магнезіт, які ўваходзіць у цэмент «Сорэля» і выпрацоўваецца на Уральскіх магнезітавых заводах, з'яўляецца дэфіцытным матэрыялам. Выходзячы з гэтага, інстытут прамысловасці паставіў задачу вывучэння даламіта (месцараджэнне — Вярхоўе каля Віцебска), каб замяніць ім каустычны магнезіт у цэменце «Сорэля». Вывучана, што апалены пры нізкай тэмпературы (650-750°) даламіт, належным чынам размолаты ў сумесі з растворамі хлорыстага або серна-кіслага магнія, дае цэмент, які мае вяжучыя ўласцівасці і вялікую трываласць.

Фібраліт на цэменце «Сорэля» з паўапаленага даламіта на растворы серна-кіслага магнія і драўлянай шэрсці, пры выпрабаванні ў заводскіх умовах, паказаў высокую трываласць, перавышаючую нармальны стандартны фібраліт.

Такім чынам устаноўлена магчымасць не толькі часткавай, але і поўнай замены дэфіцытнага для БССР каустычнага магнезіта мясцовым даламітам.

Вытворчасць фібраліта не патрабуе складаных машын і спецыяльнага абсталявання.

Развіццё гэтай вытворчасці аслабаняе фібралітавыя заводы ад каустычнага магнезіта і разгружае транспарт ад яго перавозкі, зніжае сабекошт фібраліта і будаўніцтва.

ЗАПАРОЖАЦ.

Ад торфу да бурага вугалю

У сучасны момант вядома каля 20 розных відаў торфу. У групе лясного торфу сустракаецца даволі радкі від торфу, які з'яўляецца пераходным да бурага вугалю. Улясцівасці гэтага торфу вельмі цікавыя.

Пры работах па дэтальнаму даследванню торфяных масіваў для існуючых і праектируемых торфяных прадпрыемстваў работнікі геабатанічнай секцыі інстытута прамысловасці сустракалі іх не раз. Так, напрыклад, пры даследванні балот торфазавода «Большэвік» (Гомель) былі ўзяты некалькі ўзораў гэтага торфу. У свежым выглядзе такі торф—чорнага колеру надта лёгкі, бліскучы, студзяністага выгляду. Пры высыханні да 60 проц. вільгаці ён цвярдзее і ім можна мазіваць як вугалем. Высыхаючы да 20-30 проц., ён становіцца вельмі цвёрдым і царапае дрэва. Яго ступень распаду 80-90 проц., г. зн. амаль чысты натуральны калоідальны прадукт распаду расліннага астач без доступу паветра. Пад мікраскопам нераспаўшаяся частка прадстаўляе сабой нікчэмныя абрыўкі вольхі, трасніка, хвашча і іншых.

Гэты торф у першую чаргу можа быць выкарыстан для лячэння ад раўматызма, для атрымання дубільных целей, як высокаякаснае ўгнаенне і т. д.

Яго запасы вельмі невялікія і рэдка калі можна знайсці ў адным месцы такога торфу больш чым некалькі дзесяткаў тысяч кубаметраў.

Навуковы работнік
А. ПАНАМАРКОЎ

АСУШАНА 52.500 ГЕКТАРАЎ ЗАБАЛОЧАНАЙ ЗЯМЛІ

Па многіх раёнах БССР разгарнуліся работы па масавай калгаснай меліярацыі.

У бягучым годзе Белводгасам ужо асушана 52.500 гектараў забалочанай калгаснай зямлі. Сюды ўваходзіць ворная зямля, пасевы якой палярпелі ад вымачкі. Пракладзена 109 кілометраў магістральных каналаў.

45 БІБЛІЯТЭК ПРЫ МТС І СОЎГАСАХ

Пры МТС і соўгасах арганізуецца 45 новых бібліятэк. На ўкамплектаванне іх кнігамі адпушчана 90.000 руб. Ужо арганізаваны бібліятэкі ў Лельчыцкай, Слуцкай, Цялушскай і першай Менскай МТС. (БЕЛТА).

Праблема „Вялікага Дняпра"

26 верасня ў Акадэміі Навук адбылася нарада з удзелам прыбыўшага з Харкава галоўнага інжынера па праектаванню і выпрацоўцы рабочай гіпотэзы воднага чорнаморска-балтыйскага шляху «Вялікага Дняпра»—тав. Магілка.

Нарада прыняла рад важных рашэнняў, звязаных з праблемай «Вялікага Дняпра». Работа ўсебеларускага камітэта «Вялікага Дняпра» ўзмацняецца шляхам прыцягнення ў яго склад прадстаўнікоў кіруючых арганізацый БССР і, у прыватнасці, Дняпрэнэрга. Стварэцца рабочая група з 45 інжынераў, тэхнікаў і эканамістаў. Работа будзе весціся ў пастаянным і цесным кантакце з украінскім гіправодам пры СНК УССР з тым, каб не дапускаць паралелізма. Прадстаўнікі Беларусі будуць выязджаць адзін раз у месяц у Харкаў, а прадстаўнікі УССР—у Менск для падрабязнай інфармацыі аб праробленай рабоце.

На 1935 і 38 гг. для ўсебеларускага камітэта ўстаноўлена наступная тэматыка: праблема малых рэк БССР, праблема асушэння балот БССР з выпрацоўкай генеральнай схемы, завяршэнне праекта пад'язнога шляху Днепр—Менск у 1935 г., рэканструкцыя Бярэзінскай сістэмы, праблема Прыпяці (Палессе), распрацоўка генеральнай схемы прадукцыйных сіл БССР з выпрацоўкай схемы груза-патокаў па Беларусі.

У сучасны момант на тэрыторыі Беларусі працуе рад геалагічных партый. Тры партыі Акадэміі Навук і адна Украінскага гіправода праводзяць доследы па выхаду трасы «Вялікага Дняпра» праз Оршу—Віцебск па раку Ловаць. Адна геалагічная партыя Акадэміі працуе на Бярэзіне па пытанню аб пабудове водахавалень.

БЕЛЬГІЙСКІЯ ПІЛОТЫ Ў МЕНСКУ

Бельгійскія пілоты (злева направа) Ван-Шэлле Марсіель і Керсен Філіп.

26 верасня ноччу ў Менск прыехалі з Віцебска на аўтамашыне ўдзельнікі міжнародных спаборніцтваў аэрастатаў бельгійцы—капітан-пілот Керсен Філіп і пілот Ван-Шэлле Марсіель. Разам з імі дастаўлен аэрастат.

Як у нас паведамлялася раней, бельгійскі аэрастат «Брусель ООПСЛ», вылецеўшы з Варшавы, зрабіў 24 верасня вымушаную пасадку недалёка ад Віцебска.

У Віцебску пілоты правялі поўдня і азнаёміліся з горадам.

У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» капітан Керсен заявіў:

— Мы надзвычай расчулены прыёмам, аказаным нам уладай, насельніцтвам і кіраўніцтвам на тэрыторыі Совецкага Саюза. Аэрастат апусціўся на чыстае поле. Калгаснікі, заўважыўшы гэта, безадкладна з'явіліся к месцу спуску і аказалі першую дапамогу і зберлі і ахоўвае аэрастат. Вясенне кіраванне прыслала самалёт і аўтамашыну.

Просім перадаць гарачую падзяку совецкаму ўраду за дапамогу і ўвагу.

Учора днём бельгійскія пілоты выехалі курэрскім поездам у Варшаву.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІРЫ МАЙСТРОЎ БССР, УКРАІНЫ І ЗАКАЎКАЗЬЯ

ТІФЛІС, 27 верасня. (Па тэлеграфу ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

У пятым турніры (26 верасня) першае паражэнне атрымаў аўстрыйскі майстар Кмох ад чэмпіёна Кіева Канстанцінопальскага. Варасаў прыгожай камбінацыяй, зладзіўшы на дэбютную навінку ў добуце Каро-Кан, выйграў у Раузера. Выйгралі Кірыпаў у Селезнёва, Гогнідзе ў Эбрагідзе, Каспаран у Макагонава М. і Рагозін у Сарокіна. Адкладзены ў нічыйным становішчы партыя Манагонаў В.—Сліч. Без пройгрышу Гогнідзе, Макагонаў В. і Канстанцінопальскі, на чацвертым месцы Кмох.

Майстар СЛІЧ.

АД ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПРЫ ЦК ВКП(б) ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Парткалегія КПК пры ЦК ВКП(б) па Беларускай ССР паведамляе, што 20 верасня г. г., у 18 г. раніцы, у гор. Віцебску будуць разглядацца парткамісіяй ЦК партсправы наступных т.т.:

Віцебск: Вараб'ёва С. Л., Забежынскага М. А., Кірэенка, Ефрэменка А. І., Сікорскага Н. І., Сямёнава Г. Ф., Мадорскага К. Н., Андрэева Н. М., Ерпіова М. І., Оліна А. Ф., Файнберга Г. Н., Соркіна М. Г., Хоміча К. Ф., Гінзбурга Л. Л., Будрыка І. В., Жутчанка С. С., Наўныка С. Е., Шаўліса П. К.

Лёпа: Шурынава Я. В.

Сураж: Ануфрыева А. Б.

Полацк: Вайнштэйна Б. С., Суханава М. С., Валковіча Р. М., Іванова В. Ф., Шафранава В. І., Палянскага А. І., Панкова А. Я., Юдзіцкага П. Д.

Ушачы: Багатцевіча Н. П., Чумакова І. К., Вайновіча М. А., Качалана У. Ф., Ларчанка В. Л.

Расоны: Фамлюка І. І., Аўсюка Ф. І., Міхайлава, Быхавец А. М

Сіроціна: Малочка Е. С., Юдзіцкага Я. М., Аксёнава І. А., Шостак В. К.

Асвея: Кухаронка А. П

Яўка памянёных таварышоў абавязкова, пры чым апошнія павінны прадставіць водзывы аб сваёй апошняй рабоце ад мізавых партарганізацый.

Член парткалегіі КПК на Беларусі РЫЖЫКАЎ.

ПАПРАУКА

У перададзным артыкуле «Наступ страч XVII галавнае Кастрычніка», які змешчан у «Звязде» ад 27 верасня, па віне стылрэдактуры скажон пачатак сёмага абзаца ў першай калонцы. Абзац трэба чытаць: «Зараз сатрэўды ў БССР ёсць урачы стаюць пенінскай нацыянальнай палітыкі» і т. д.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Менгарком КП(б)Б склікае 29 верасня ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (вялікая зала) агульнагарадскую нараду трыкутнікаў прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менска.

На нараду запрашаюцца трыкутнікаў выклікаюцца сакратары камітэтаў ЛКСМВ, рэдактары шматтыражак і насценгазет, парткартэрі.

29 верасня 1934 года ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва адбудуцца пропсемінары для прапагандыстаў СНПІ, кандыдацкіх школ, вечарнёвай школы па ленінізму і марксіцка-ленінскага гуртка.

Менгарком КП(б)Б і рэдакцыя журнала «Работніца і калгаснік Беларусі арганізуюць 2-га кастрычніка роўна ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ РАБОТНІЦ-УДАРНІЦ менскіх прадпрыемстваў і пісьменнікамі — удзельнікамі першага ўсесаюзнага з'езда пісьменнікаў.

Сакратары парткомаў і старшыні вайсковых пазіцый атрымаць білеты на вечар у гаркоме КП(б)Б (пакой № 50).

ГАРКОМ КП(б)Б

РЭДАКЦЫЯ ЖУРНАЛА «РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ».

Нам. адказ. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

МЕНСК

НАДВОР'Е СЁННЯ

Паводле вестак бюро надвор'я, у Менску тэмпература паветра ноччу з 27 на 28 верасня 6—9 градусаў, сёння днём—15—18 градусаў. Значная з праяўленнямі воблачнасць без асадкаў, ветры слабыя да ўмераных заходніх напрамкаў з пераходам да паўночна-заходніх напрамкаў. Бачнасць умераная да добрай.

⊙ ⊙ ⊙

ПАМЯЦІ МАРЫІ СКЛАДОЎСКАЙ-КЮРЫ прысвячаецца пасяджанне фізіка-матэматычнай секцыі Акадэміі Навук, якое адбудзецца 29 верасня ў 7 гадзін вечара ў вялікай аўдыторыі фізічнага корпуса БДУ. Праф. Е. К. Успенскі прачытае даклад аб штучнай радыёактыўнасці.

На выстаўцы промкаапераціы.

ВЫСТАЎКА ДАСЯГНЕННЯЎ па аховe здароўя працоўных арганізуецца да ўсебеларускага з'езда совецкай наркаматам аховы здароўя.

НОВЫ АСАРТЫМЕНТ ПРАДУКЦІІ пачынае выпускаць у чацвертым квартале Белсадвінпром. Будзе выпушчана 15.000 дэкалітраў сіропу, 50 тон варэння, пераважна яблычнага і 150 тон джэму (англійскага мармеладу). Выпуск павялічваецца да 150 тон.

ВЫПУСК РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ШКОЛЫ ПЛАНЕРЫСТАЎ ПС АСОАВІЯХІМА адбыўся 26 верасня. Школай выпушчаны 34 інструктары-планерысты. Сярод іх 5 жанчын.

АСЕННІЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ФУТБОЛУ па першынства БССР пачынаюцца сёння на ўсебеларускім стадыёне. Прымаюць удзел каманды Чырвонай арміі, «Дынамо», профсаюзаў і прамысловай кааперацыі.

РАНІШНІКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ будуць наладжвацца ў тэатрах не менш двух раз у месяц.

СЯРГЕЙ ЗНАЁМЫ

Агрэх

Калі Курковічу сказалі, што ў жыце, пад якое арала трэцяя брыгада, ёсць агрэхі, ён не паверыў, а праз нейкі час нават забыўся на гэта. І толькі пад вечар, правяраючы ўборку лубіну, прыпомніў і накіраваўся паглядзець. Сухія струкі лубіну шасталі каля ног і часам трэскаліся, тады Майсей Іванавіч спыняўся і крычаў на баб, чаму яны так павольна працуюць.

— Варочаюцца, як замакі тыя. Не ведаеце хіба, што сёлета лубін з жытам лоб у лоб ставіцца.

Жанкі жартавалі, «падкалвалі» палявода лёгкімі кпінамі і разам з тым хутчэй завіхаліся каля работы. Адчувалася, што людзям не зручна за папрокі на ніве.

Курковіч ішоў, абмежкам і глядзеў на сыраварню, набітую немалочным збожжам. Відаць было, як рупна завіхаюцца людзі каля малатарні, а па полю на кані Пракоп Казыра, вазе воз жыта. Мяхоў на возе багата і адзін, што лянуць у вадку, вельмі-ж звесіўся, так, што вось-вось зваліцца далоў.

— Пракоп, мех упадзе.

Пракоп падтрымлівае мех рукой і пагоняе каня.

Праходзячы абмежкам, Майсей Іванавіч наступіў на камень і той скаціўся на канюшыніча. Курковіч ступіў некалькі крокаў і спыніўся. Зусім нечакана захацелася падняць камень і кінуць на дарогу. Цяжка сказаць, чаму ўсё-ж паляводу Курковіч нейкі час стаяў і вагаўся. І толькі пачакаўшы, калі схаваецца за хатамі Пракоп, ён абаруч узяў камень і шпурнуў яго ў каляіну.

Так ён кінаў каменні даўно, мо' гадоў сем таму назад, калі рабіў агляд сваёй уласнай нівы. Толькі тады часам здаралася, што ляцеў камень не ў каляіну дарогі, а на ніву суседа, каб выклікаць хвалю абурэння ды «спагнаць тым злосць». Цяпер Курковіч паглядзеў, пасуспокоіўся. Вараная, добра даглядженая кабыла церлася галавой аб плячо брыгадзіра. Збоку нехта распрогнуў каня ставіў на месца калёсы. Было цемнавата, і Сяргей Гулько ўключыў на канюшні ліхтары.

— Ну што ты там капаешся, стаў, няхай кабыла есць, — звярнуўся Гулько да Барыса, які ў цемені абчышчаў конскія капыты ад гною і бруду, што набіліся за дзень. А ў прастэрнай і чыстай канюшні коні спакойна елі свежы мурог. Здаўк было чуваць, як яны труць сакавітую траву і відаць было, як павольна ідзе на сваё месца кабыла Яловіка.

У калгасе часта гаворыць і дзівяцца, чаму ў Яловіка ўсе коні добрыя. У іншых брыгадах яны не такія. Вось у комсамольскай дык коні недагледжаныя. Нават сам Навум Каплан дзівіцца, як гэтыя коні ўпраўляюцца з работай. А ў брыгадзе Яловіка і коні той самай пароды, і работы больш робяць, і ўсё-такі яны сытыя, гладкія і чыстыя. На любым на кірмаш не соромна ехаць, на любым маладых да зяцьва не соромна везці. А чаму так? Догляд, парадак. У Барыса кожны ў брыгадзе мае свайго каня, сваю вупраж. Нават жонка Сяргея Гулько, якая ні дзед, ні бацька, ні нават мужык ніколі не меді свайго жарабяці, цяпер у калгасе яна мае добрага варанога каня. На ім вной вазіць і то люба. Увесь час глядзі, каб не разнёс. Але і глядзіць яна за канём. Неяк раз, прышоўшы на канюшню, ледзь валасоў не павыдзірала Сяргею, калі ўбачыла, што за драбінкай каня пуста...

Яловік паставіў кабылу і, праверыўшы гужы ў хамутах, пазнавата накіраваўся дамоў... А пад самы канец пасяджэння ён прышоў на прыўлекне. Прысеўшы на падлогу каля печы, ён слухаў, як Курковіч дакладваў пра другі ўкос, як потым Каплан дапякаў за марудную мяцьбу і павольнае ворыва над жытам і на гародзе ўсё добра. Ён з павагаю выпіт з кішэні папяросы, прапанаваўшы Барысу.

Барыс не адмовіўся, ён узяў папяросу і звярнуўся да Трасніцкага Змітра прыкурыць. Змітрок, як і заўсёды, спакойна зірнуў на Яловіка. Але Барысу здалося, што гэта не так ён адчуваў у гэтым позіку нейкую злую і едкую ўсмешку. А за што? Мо' за тое, што ў брыгадзе Яловіка агрэх, а вось у брыгадзе Трасніцкага няма агрэху. Змітрова брыгада складаецца з цесляроў. Яна з поспехам скончыла ўсе цеслярскія работы, потым добра паказала сябе на ўборцы, а цяпер паслалі мальцаў на другі ўкос, дык яны і там лепш за ўсіх косяць. Яловік прыкурыў і папрасіў слова:

— Усе пачалі гаварыць пра агрэх у нашай рабоце. Не ведаю, я не заўважыў агрэха, інспектар па якасці таксама не заўважыў. Але калі толькі ёсць, то трэба паглядзець, праверыць.

— Заўтра і праверым.—па-гаспадарску сур'ёзна адказаў Каплан.

На другі дзень яшчэ да выхаду на работу брыгадзіры разам з кіраўніцтвам калгаса выйшлі праверыць агрэх. Раніца была цёплай і абяцала гарачы і светлы сонечны дзень. А брыгадзіры ішлі, моўчкі, павольна перастаўляючы ногі. Здавалася, яны нешта цяжкае нясуць на плечах, здавалася, нешта пяцце, цісне іх кланяючы долу галовы.

Прышлі і зеленаватасіні мурог руні адразу выдаў агрэх. Людзі настаялі, паглядзелі і, падпісаўшы пратакол, сабраліся ісці назад, як раптам Барыс Яловік, ступаючы па зеленаватаму жыту, пашоў да незасеянага лапікла. Ён хупенька прыгнуўся і рукамі пачаў раскопваць зямлю. Праз момант усе галовы схіліліся над агрэхам. З-пад раскапанай рукамі зямлі відаць была лысіна вялізнага падземнага каменя. Усе неяк з палёгкай уздыхнулі і пасвятлеўшымі вачыма зірнулі на Яловіка. А той, выпрачоры аб траву абмежка рукі, іранічна звярнуўся да Каплана:

— Тав. старшыня, прашу вас аштрафаваць гэтых малайцоў за тое, што выбілі снежку ў жыце.

Усе ад душы зарагаталі.

Калгас «Чырвоная зорка»,
Кішчэна-Слабода,
Барысаўшчына.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. керэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН. Уп. Галоўлітбела № К—3240.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1) СЁННЯ ЗЯМЛЯ І НЕБА Пачатак ў 8 гадзін веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" НОВАЯ ПРАГРАМА У фай—канцэрты. вдда.

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Пролетарый" „ПРАСПЕРЫЦІ" Звыш прагр. Муз-джаз.

Кіно „Інтэрнацыянал" НОВАЯ ПРАГРАМА Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно

Кіно „СПАРТАК" Ад 28 верасня дэманструецца вядомы фільм КРЫЖ І МАУЗЕР драма ў 8 частках. У праграме—кіно-хроніка. ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ. КАСА—з 4 гадзін дня.

Смалянскі тэхнікум насенаводства прадаўжае НАБОР і іспыты студэнтаў на 1 курс тэхнікума да 5-га настрычніка 1934 г. Студэнты, залічаныя ў тэхнікум, забяспечваюцца інтэрнатам, пральняй, лазняй, стыпендыя па паспяховасці і сталовай. Адрас: ст. Смаляны, Аршанскага раёна Смалянскі тэхнікум насенаводства.

Дырэкцыя.

Раймеліяратар Чырвонапольскага раённу САЗОНАЎ кінуў самавольна работу. Просьба да арганізацый, ведаючых месца работы САЗОНАВА, паведаміць Белводгасу—гор. Менск, Дом урада, пакой 460 для прыцягнення яго да судовай адказнасці.

Белводгас.

Менскі гарадскі аддзел народнай асветы паведамляе, што арганізацыі, якія не зарэгістравалі сваіх БІБЛІЯТЭК, павінны абавязкова зарэгістраваць апошнія ў Гарана, пакой 29, памяшканне Горсовета, да 29 верасня б. г.

Гарана.

29 верасня ў 8 гадзін вечара ў Анатамічным корпусе Медінстытута, вялікая аўдыторыя № 101, адбудзецца АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ на ступень кандыдата медыцынскіх навук аспірантам ЛЫНОЎСКІМ І. П. на тэму „Прычыны зрэтоўтэма (рафаніо, барацьба з ім і метады даследвання спарыны)". Афіцыйнымі апанентамі вызначаны праф. Амінчанкі В. А., праф. Мегілаў чын З. Н. і праф. Фрыд С. М. Запрашаюцца навуковыя работнікі і студэнты.

Дырэктар медінстытута Шульц.

29 верасня ў 8 гадзін раніцы Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна, Гарана і культаддзел ЦСПСБ скліканць у памяшканні Дзяржаўнай бібліятэкі (пакой № 26) НАРАДУ БІБЛІЯТЭКАРАЎ гор. Менска палітасветных, масавых, школьных, профсаюзных і вайсковых бібліятэк па пытанню выканання інтарасаў чытачоў масавымі бібліятэкамі.

Даклад т. Хамецкага.

Цэнтральны прамысел арцелі імя ДЗЕРЖЫНСКАГА, Гомельскага р-на (ст. Піваншчына) ліквідуецца. Прэтэнзіі ад дзяржаўна-кааператыўных арганізацый і ад прыватных асоб прымаюцца да 10-X—1934 г. Пасля 10-X—34 г. ліквідком нікіх прэтэнзій прымаць не будзе.

Ліквідкам.

Галоўная дзяржаўная санітарная інспекцыя Наркамаховы здароўя БССР даводзіць да ведама ўстаноў і грамадзян, аштрафаваных дзяржінспектарамі, што, паводле палажэння аб дзяржінспекцыях, зацверджанага ЦВК і СНК БССР ад 3-V—34 года, АБСКАРДЖАННІ вышэйстаячаму дзяржінспектару на няправільнасць наложанага штрафу могуць быць падаваны толькі на працягу першых трох дзён з дня атрымання пастановы аб штрафе. Пасля гэтага тэрміну апеляцыі не разглядаюцца.

Галоўны дзяржінспектар БССР Олінер.